Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№230 (28594)

29 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16

Якім будзе біяметрычны пашпарт?

СТАР. 4

Увага: прамая лінія!

Газета «Звязда» правядзіць прамую лінію па тэме «Як спажыўцу адстаяць свае правы?» Ці можна вярнуць у краму абутак, набыты падчас распродажу? Што рабіць, калі замарожаная рыба аказалася сапсаванай? Ці можна не плаціць за стрыжку, калі яна вам не падабаецца? Куды звяртацца, калі вам прадалі бракаваны тавар?

Гэтыя і іншыя пытанні можна будзе задаць у чацвер, **30 лістапада, з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **287-18-71.** Адказваць на іх будзе **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

Папярэдне пытанні можна задаць па тэлефоне 287-17-50 ці даслаць на электронны адрас lubneuskaya@zviazda.by з пазнакай «прамая лінія».

ЛІЧБА ДНЯ

54 тысячы

замежных грамадзян з 67 краін свету наведалі ў 2017 годзе Беларусь па бязвізавым рэжыме да пяці сутак праз Нацыянальны аэрапорт. Большая частка з іх — грамадзяне Германіі, больш за 8 тысяч. Каля 5,5 тысячы турыстаў — з Польшчы, з Італіі прыехалі 4,5 тысячы чалавек, з ЗША — 4 тысячы, з Вялікабрытаніі — 3,8 тысячы. Перш за ўсё яны знаёмяцца з Мінскам. Беларуская сталіца, дарэчы, упершыню ўвайшла ў дваццатку самых спартыўных гарадоў свету па рэйтынгу інфармацыйнага агенцтва Sportcal. Брытанскае выданне The Times уключыла Мінск у спіс 30 гарадоў, найбольш прывабных для ўікэнда. Самы папулярны і масавы ў Беларусі — культурна-пазнавальны турызм, гэтаму спрыяюць аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, якія ў нас захаваліся.

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 29.11.2017 г.

Долар ЗША	2,0000 ▲
Еўра	2,3797 ▼
Рас. руб.	0,0342 ■
Укр. грыўня	0,0743 ■

ISSN 1990 - 763X

Дзікеўскі дойлід

Іосіф ВЕРШЫЛОЎСКІ — жыхар аддзялення кругласутачнага знаходжання для пажылых людзей, якое знаходзіцца ў вёсцы Дзікева Шаркаўшчынскага раёна, зрабіў макет былой вясковай базавай школы (пасля закрыцця школы ў будынку з'явілася гэтая сацыяльная ўстанова). Іосіф Антонавіч — былы будаўнік, таму з лёгкасцю ўзяўся за выраб паменшанай копіі тыпавога будынка савецкай эпохі. Пры гэтым ён ніколі не займаўся архітэктурай і не канструяваў падобныя макеты. На працягу некалькіх месяцаў пенсіянер вылічваў прапорцыі сцен, вокнаў і дзвярэй, плошчу прылеглай тэрыторыі і ўнутранага дворыка, каб архітэктурная кампазіцыя адпавядала аналагу. Потым выразаў, выпілоўваў, клеіў, маляваў.

Многія жыхары аддзялення, а іх тут трыццаць пяць чалавек, любяць збірацца каля архітэктурнага твора самадзейнага дойліда.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Падзея

Стратэгію абмяркуюць на з'ездзе вучоных

II з'езд вучоных Рэспублікі Беларусь пройдзе 12—13 снежня. Удзел у ім возьмуць 2100 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны

Як паведамляе прэс-служба НАН Беларусі, чакаецца прыезд у Беларусь вялікай колькасці вядомых навукоўцаў з Саюзнай дзяржавы, краін СНД, з замежных Акадэмій навук, сусветных навукова-даследчых арганізацый і цэнтраў.

У першы дзень работы з'езда будуць працаваць дзевяць секцый, прысвечаных асноўным кірункам развіцця навукі і міжнароднаму супрацоўніцтву. Прадугледжана таксама арганізацыя работы маладзёжнай секцыі. Пленарнае пасяджэнне адбудзецца 13 снежня. Ключавым дакументам, які будзе вынесены на II з'езд вучоных Беларусі, стане праект Стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040». У дадзены момант ён праходзіць грамадскае абмеркаванне. У Стратэгіі вызначаны прыярытэты доўгатэрміновага развіцця навукі і тэхналогій, а таксама комплекс інструментаў удасканалення навукова-тэхнічнай сферы, якія забяспечаць эканамічны рост Беларусі і выхад у перспектыве на сусветны ўзровень канкурэнтаздольнасці па шэрагу кірункаў.

Мяркуецца, што дзякуючы рэалізацыі Стратэгіі да 2040 года навукаёмістасць ВУП павінна скласці 3%, доля прарыўных навуковых даследаванняў і распрацовак — 30% у агульным аб'ёме, доля высокатэхналагічных сектараў у структуры эканомікі — 10%. У агульным аб'ёме вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў інавацыйная прадукцыя будзе займаць 25 працэнтаў.

2017 год аб'яўлены ў Беларусі Годам навукі, і правядзенне з'езда стане яго выніковым мерапрыемствам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

nikalaeva@zviazda.by

■ Акцэнт на здароўе

ТОНКАЯ РАБОТА

Штогод у цэнтры дзіцячай нейрахірургіі выконваецца каля 600 аперацый

У Мінску пачаўся I Еўразійскі з'езд дзіцячых нейрахірургаў. Да ўдзелу запрошаны вядучыя спецыялісты з больш як 15 краін блізкага і далёкага замежжа. Арганізатарамі выступаюць Міністэрства аховы здароўя Беларусі, Еўразійская асацыяцыя дзіцячых нейрахірургаў, усерасійскае і ўкраінскае таварыствы па дзіцячай нейрахірургіі, Міжнароднае таварыства па дзіцячай нейрахірургіі (ISPN), Еўрапейскае таварыства па дзіцячай нейрахірургіі (ESPN).

— У апошнія гады нейрахірургія наогул і дзіцячая ў прыватнасці развіваюцца неймаверна дынамічна, — адзначае **галоўны хірург Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Сяргей ЗАРЭЦКІ.** — Тое, што ў мінулым стагоддзі выконвалася на працягу некалькіх гадзін, сёння дазваляе пазбегнуць вялікай траўматызацыі, бо прымяняюцца малаінвазійныя, эндаваскулярныя ўмяшанні. Нейрахірургія — гэта сімбіёз некалькі кірункаў, не толькі неўралогіі і хірургіі, але і той жа псіхатэрапіі, а калі гэта галіна медыцыны яшчэ і з дзецьмі звязана, трэба мець на ўвазе вельмі тонкую работу.

Да 1990-х гадоў дзецям у нашай краіне аперацыі выконваліся там жа, дзе і дарослым. Затым было адкрыта спецыялізаванае нейрахірургічнае дзіцячае аддзяленне, якое працавала для маленькіх пацыентаў з усёй краіны. Стварэнне і рэканструкцыя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі дазволіла, нарэшце, айчыннай дзіцячай нейрахірургіі выйсці на новы ўзровень — адкрылася аддзяленне еўрапейскага ўзроўню з адпаведным аснашчэннем і спецыялістамі, якія стажыраваліся за межамі краіны.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Саміт калектыўнай бяспекі

Сесія Савета калектыўнай бяспекі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы адбудзецца заўтра ў Мінску. Удзел у ёй прыме Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

На саміце будуць падведзены вынікі беларускага старшынства ў АДКБ у 2017 годзе. Беларусь ставіла задачы ўзмацніць уплыў арганізацыі на міжнароднай арэне, павысіць аператыўную гатоўнасць Калектыўных сіл, гарантаваць эканамічную бяспеку дзяржаў-членаў, а таксама рэалізаваць комплекс дадатковых мер па процідзеянні міжнароднаму тэрарызму, распаўсюджванню наркотыкаў і незаконнай міграцыі ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі.

Чакаецца, што па выніках саміту будзе прыняты шэраг рашэнняў па розных напрамках дзейнасці АДКБ, у якіх, у тым ліку, знойдуць адлюстраванне прыярытэты беларускага старшынства.

Кіраўнікі дзяржаў таксама абмяркуюць найважнейшыя праблемныя моманты сучаснай абстаноўкі ў свеце і далейшае развіццё арганізацыі ў якасці магутнай структуры, якая гарантуе бяспеку ў рэгіёне.

На службе сяброўства краін

У Палацы Незалежнасці прайшла сустрэча з Паслом Казахстана

Кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка рэгулярна сустракаецца з дыпламатамі, якія шмат зрабілі для развіцця адносін сваёй краіны з Беларуссю. Такія мерапрыемствы традыцыйныя напрыканцы дыпламатычных місій. Учора Прэзідэнт сустрэўся з Ергалі Булегенавым, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Казахстан у нашай дзяржаве.

Сёння нашу краіну наведвае лідар гэтай краіны, таму сустрэчу з казахстанскім паслом Прэзідэнт назваў «добрым уступам» да гэтага візіту.

— Што дрэнна — што сябры з'язджаюць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Жыццё дыпламатаў такое, як і ў ваенных. Адслужыў тэрмін — паехаў на іншую работу. Мы гэта разумеем, але яшчэ раз падкрэсліваю: вы для нас чалавек не чужы. Вы рабілі вельмі шмат для таго, каб у нас былі вельмі добрыя адносіны паміж дзвюма краінамі.

Беларускі лідар назваў Ергалі Булегенава «сапраўдным прадстаўніком казахстанскага народа»:

— Не збіраюся тут казаць аб прасунутых нашых адносінах. Казахстан — гэта адна з краін, з якімі мы маем самыя блізкія адносіны. Мы ў эканамічным саюзе з вамі (Еўразійскім эканамічным саюзе. — **Аўт.**), у нас няма палітычных рознагалоссяў, мы аднолькава глядзім на парадак дня міжнародных адносін. Словам, разыходжанняў у нас практычна няма ніякіх, і ў гэтым вялікая ваша заслуга — ва ўмацаванні сяброўства паміж Казахстанам і Беларуссю.

Кіраўнік нашай дзяржавы выказаў спадзяванне, што дыпламат назаўсёды застанецца сябрам нашай дзяржавы.

У тэму

Ергалі Булегенаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь, заявіў па выніках сустрэчы з беларускім лідарам:

— Амаль шэсць гадоў працы ў Беларусі праляцелі вельмі імкліва, відаць, таму, што я быў пастаянна ў рабоце па ўмацаванні нашых двухбаковых адносін. Яны ў нас маюць глыбокія карані. Думаю, я зрабіў свой унёсак у справу па іх пашырэнні.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

«Дарожная карта» на падыходзе

Кіраўнік дзяржавы сустрэўся з віцэ-прэзідэнтам Венесуэлы па пытаннях планавання

Месяц таму нашу краіну з афіцыйным візітам наведаў Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура. Падчас сустрэчы з беларускім лідарам было пацверджана агульнае жаданне аднавіць супрацоўніцтва.

А ўчора падчас сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з віцэ-прэзідэнтам па пытаннях планавання — міністрам планавання Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Рыкарда Менэндэсам сярод іншых пытанняў абмяркоўваўся візіт кіраўніка нашай дзяржавы ў Каракас — ужо ў 2018 годзе.

— Не хаваю: чакаў гэтай сустрэчы, — прызнаўся беларускі лідар на пачатку размовы. — Перш за ўсё, каб павіншаваць вас з пераканаўчай перамогай на паказальных рэгіянальных выбарах. Я вас вельмі моцна прашу: перадайце майму сябру Прэзідэнту Венесуэлы віншаванні ў сувязі з гэтым. Усё ідзе так, як і павінна ісці. Камусьці ваша перамога не падабаецца, і яны робяць спробы парушыць тую кансалідацыю, якая намецілася ў грамадстве Венесуэлы.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, не трэба гэтаму надаваць надзвычайнае значэнне. Наша краіна гэта таксама перажыла. Але прыйдзе час — і ў свеце зразумеюць ролю Венесуэлы.

— Вы вельмі хутка пераадолееце гэтыя перашкоды ў сувязі з тым, што ў апошнія гады, нават месяцы, свет катастрафічна хутка мяняецца, — упэўнены Прэзідэнт. — Галоўнае, каб вы былі адзінымі ў Венесуэле і верылі ў сваю перамогу.

Што да нашых двухбаковых адносін, яны ў палітычных, дыпламатычных сферах як былі, так і застаюцца сяброўскімі і брацкімі, запэўніў беларускі лідар венесуэльскага госця:

— Яшчэ раз хачу пацвердзіць: усё, што мы сёння маем, усё, што мы сёння можам, мы гатовы пакласці на чашу вашага поспеху ў Венесуэле.

Паміж лідарамі дзвюх краін была дамоўленасць стварыць «дарожную карту» па паглыбленні двухбаковага беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва.

— Ужо ў найбліжэйшы час, а дакладна — падчас майго візіту ў Венесуэлу — мы зможам значна прасунуцца ў нашых адносінах і не толькі зацвердзіць гэтую «дарожную карту» — мы ўжо пачнём яе рэалізоўваць, — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

У Беларусі ёсць тое, што патрэбна Венесуэле — у поўным аб'ёме. А ў Венесуэле ёсць тое, што патрэбна нам.

— І мы на гэтым месцы нават можам нешта зарабіць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я думаю, гэта трэба пакласці ў аснову нашых дамоўленасцяў і «дарожнай карты».

Рыкарда Менэндэс паведаміў, што венесуэльскі лідар вялікую ўвагу ўдзяліў падрыхтоўцы і правядзенню бягучага візіту. Па яго словах, тыя кірункі, праекты, якія абмяркоўваліся каля месяца таму на сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і Нікаласа Мадуры, зараз распрацоўваюцца.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

МОСТ ДЛЯ ВЯЛІКАЙ ЕЎРОПЫ

У сталіцы адбылося пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ

Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва (ЦЕІ) мае тры асноўныя вымярэнні: парламенцкае, урадавае і бізнес-супольнасці. Учора ў Савеце Рэспублікі адбылося ключавое з парламенцкіх мерапрыемстваў у межах старшынства Беларусі ў гэтай арганізацыі ў 2017 годзе — пасяджэнне Парламенцкай асамблеі ЦЕІ.

Як ужо паведамляла «Звязда», цэнтральнай тэмай пасяджэння сталі інфармацыйныя тэхналогіі ў захаванні бяспекі. «Лічбавая трансфармацыя, пабудова лічбавай эканомікі — ужо новая рэальнасць. Гэта ўклад жыцця, новая аснова для развіцця сістэмы дзяржаўнага кіравання, эканомікі, бізнесу, сацыяльнай сферы, усяго грамадства. Наша краіна можа таксама выступіць платформай для супрацоўніцтва партнёраў ЦЕІ ў ІТ-індустрыі», — лічыць **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.** Так, па ацэнцы Міжнароднага саюза электрасувязі, у 2017 годзе Беларусь па індэксе развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій заняла 32-е месца ў рэйтынгу са 175 краін, па развіцці шырокапалоснага доступу — 21-е месца сярод 195 краін, па індэксе гатоўнасці да электроннага ўрада — 49-е са 193 краін. З 2012 года Беларусь уваходзіць у топ-30 вядучых краін свету ў галіне распрацоўкі заказнога праграмнага забеспячэння.

Эрык ЧАРНОВЕЦ, намеснік генеральнага сакратара Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, адзначыў, што гэта першае старшынства Беларусі ў ЦЕІ, «таму яно вельмі важнае». «Тым не менш Беларусь з'яўляецца членам ЦЕІ ўжо 21 год. У склад арганізацыі ўваходзіць 10 дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза і 8 дзяржаў не членаў ЕС, — адзначыў намеснік генеральнага сакратара ЦЕІ. — Місія і мэта — дапамагчы дзяржавам, якія не ўваходзяць у Еўрапейскі саюз, на іх шляху па руху да ЕС. Яшчэ адна мэта ЦЕІ — стаць своеасаблівым мостам паміж макрарэгіёнамі, якія ўваходзяць у нашу арганізацыю. У прыватнасці, паміж Балтыйскімі краінамі, краінамі ракі Дунай і іншымі макрарэгіёнамі».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

Каментарый у тэму

Уладзімір ВІЦЮК, кіраўнік дэлегацыі Малдовы, віцэ-спікер парламента:

— Малдова, са свайго боку, мае цэлы шэраг напрацовак у ІТ-тэхналогіях як у заканадаўчай сферы, так і ўжо ў тэхнічным выкананні. Мы ведаем, што цэлы шэраг краін, і ў першую чаргу Беларусь, дастаткова сур'ёзна назапасілі патэнцыял і вопыт у гэтай сферы. І мы гатовыя і зацікаўленыя ўзаемна падзяліцца тымі напрацоўкамі, якія ёсць у абедзвюх краін. І, вядома, мы высока ацэньваем старшынства і дзейнасць Беларусі. Цэлы шэраг дакументаў быў сур'ёзна прапрацаваны за гэты год. Ён важны для ўсіх удзельнікаў асамблеі і для развіцця ІТ-тэхналогій.

Вольфганг ГЕРСТЛ, кіраўнік дэлегацыі Аўстрыі:

— Мы вельмі рады, што Беларусь праяўляе зараз такую ініцыятыву і што мы можам супрацоўнічаць з рознымі краінамі ў гэтым кантэксце. Сучасны свет — гэта свет глабалізацыі. І таму ўсе краіны ў той ці іншай ступені сутыкаюцца з аднымі і тымі ж пытаннямі. З аднаго боку, лічбавыя тэхналогіі ўяўляюць вельмі важны аспект нашага жыцця і даюць шмат магчымасцяў, з другога, — у нас ёсць досыць вялікая колькасць перашкод. Таму мы павінны працаваць на карысць развіцця і адначасова змагацца, скажам, з кіберзлачыннасцю і распрацоўваць належную нарматыўна-прававую базу для таго, каб лічбавыя тэхналогіі дапамагалі нам у нашай дзейнасці.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

ЦЯЖКІ РОСТ АРШАНШЧЫНЫ

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў абмеркавалі праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага раёна да 2020 года

Пачынаючы з сярэдзіны красавіка над выкананнем даручэння кіраўніка дзяржавы аб развіцці Аршанскага раёна працуе ўрад сумесна з Віцебскім аблвыканкамам і Аршанскім райвыканкамам. Першапачатковая задача — павышэнне эфектыўнасці фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў рэгіёна і вызначэнне перспектыў іх развіцця.

За 10 месяцаў гэтага года аб'ём прамысловай вытворчасці на Аршаншчыне ўдалося павысіць на 0,5% да адпаведнага перыяду мінулага года. У сельскай гаспадарцы таксама намецілася станоўчая дынаміка, павялічыліся экспарт і сярэдні заробак. «Дасягнуць гэтых вынікаў было немагчыма без вырашэння многіх складаных праблем пры абмежаваных грашовых рэсурсах. Так, былі разблакаваныя рахункі, без затрымак выплачваецца зарплата, палепшаны ўмовы працы, наведзены парадак у цэхах і на тэрыторыях прадпрыемстваў. Цяжка, але паслядоўна вырашаюцца пытанні па фінансаванні аб'ектаў будаўніцтва аграпрамысловага комплексу», — паведаміў **прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ.**

Ён нагадаў, што на мінулым тыдні першы намеснік прэм'ер-міністра Васіль Мацюшэўскі і старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў правялі ў Оршы чарговую рабочую сустрэчу з кіраўнікамі банкаў, Мінсельгасхарча, Мінфіна і Мінэканомікі. Вырашалася асноўная праблема — закрэдытаванасць прадпрыемстваў і адсутнасць рэальнага забеспячэння крэдытаў. «Аднак без нарошчвання вытворчасці малака і мяса не будзе эфектыўна працаваць уся вертыкаль інтэграванай структуры аграпрамысловага комплексу — а гэта аснова эканомікі раёна», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр лічыць, што, акрамя аператыўных мер, раёну патрэбна сярэднетэрміновая стратэгія развіцця, дзе на аснове комплекснага аналізу вызначацца дадатковыя пункты росту і мэтавыя арыенціры. Для гэтага прынята рашэнне аб распрацоўцы праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Аршанскага раёна да 2020 года. «У працэсе работы над праграмай з'явілася больш дакладнае разуменне развіцця не толькі дзеючага патэнцыялу, але і стварэння новых напрамкаў, кшталту інфармацыйных тэхналогій, а таксама новых падыходаў да ўдасканалення рознічнага гандлю, прадпрымальніцтва», — паведаміў прэм'ер-міністр. Асноўны распрацоўшчык дакумента — Міністэрства эканомікі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

Извещение о проведении 14 декабря 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Мостострой»

Предмет торгов
«здание склада-цеха мастерских» общей площадью 70,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16500; «здание проходной» общей площадью 43,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16501; «ворота въездные металлические», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16502; «забор (ограждение базы (железобетонное)) протяженностью 248,42 м», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16503; «площадка базы со смотровой ямой», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16504; «забор (ограждение базы (металлическое)) протяженностью 81,58 м», инв. № в ЕГРНИ 330/С-16505; «здание надворной уборной» общей площадью 3,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 330/С-16506; растворо-бетонный узел (инв. №9278); шкаф КТП 100-10 (инв. №192); трансформатор ТМГ-100-10 (инв. №198)
Местонахождение: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Гоголя Н. В., 151
Площадь земельного участка: 0,5642 га, кадастровый номер: 341500000001000134
Начальная цена: 73 315,20 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 7 300,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «Мостострой», пер. Домашевский, 11, 220036, г. Минск, тел. (017) 208-87-81.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Мостострой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 14 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 30.11.2017 по 12.12.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 669-82-46, (029) 395-99-47 (ОАО «Мостострой»).

Антикризисный управляющий Правовая компания «БелПрофКонсалт» объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества СООО «НТС» (дата торгов: 06.12.2017 в 14.00), имущества СООО «НТС» (гостевая автостоянка) (дата торгов: 06.12.2017 в 10.00), имущества ТПЧУП «СТАНКОТЕХИНВЕСТ» (дата торгов: 06.12.2017 в 15.00), имущества ООО «ТрейдМаркСтар» (дата торгов: 30 ноября 2017 в 11.00) , дебиторской задолженности ООО «БелСтройСвит» (дата торгов: 13.12.2017 в 15.00), дебиторской задолженности ООО «Ват-Метиз» (дата торгов: 21.12.2017 в 10.00), имущества ООО «Изоляционные технологии Строй» (дата торгов: 06.12.2017 в 10.00), дебиторской задолженности ООО «Росбизнеспак» (дата торгов: 14.12.2017 в 10.00).

Место проведения торгов: г. Минск, пр. Победителей, 127, оф. 312.

Подробная информация о дате, времени и порядке проведения торгов, предлагаемых к продаже лотах, начальной цене и размере задатков, продавце и организаторе, иная информация, требуемая в соответствии с законодательством, размещена в Едином государственном реестре сведений о банкротстве: http://bankrot.gov.by

УНП 191875692

Извещение о проведении вторых повторных торгов по продаже предприятия ОАО «Рыбный ряд» как имущественного комплекса

Начальная цена: 1 616 800,00 BYN. Сумма шага аукциона: 80 840,00 рублей, 00 копеек.

Вторые повторные торги в форме аукциона по продаже предприятия как имущественного комплекса (ОАО «Рыбный ряд»).

Сведения о предмете аукциона: предприятие как имущественный комплекс (№0001323), созданное на базе Открытого акционерного общества «Рыбный ряд», расположенное по адресу 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, путем продажи на аукционе с начальной ценой продажи: 1 616 800,00 рублей, 00 коп. без учета НДС.

Предприятие расположено на двух земельных участках общей площадью 2,763 га, расположенных по адресам 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16 (2,4774 га), ул. Орловского, 25Б (0,2856 га), предоставленных на праве постоянного пользования.

Условия продажи – нет.

Организатор аукциона: антикризисный управляющий Казяба Сергей Николаевич.

Аукцион проводится 15.12.2017 года в 11.00 по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16.

Задаток: 161 680,00 рублей, 00 коп.

Задаток перечисляется: ОАО «Рыбный ряд» 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, УНП 700067281, р\с BY43BLBB30120700067281001001 в ЦБУ №831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, БИК BLBBBY2X.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16 с 30.11.2017 с 8.30 до 12.30 и с 13.00 до 17.00 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17.00 14.12.2017 г.

Сведения о продавце: «Рыбный ряд» 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16.

За справками обращаться по тел.: (0225) 48-54-41, 48-58-20, (044) 730-22-10, (029) 310-52-83. Информация о составе имущества доступна на сайте www.bankrot.gov.by.

УНП 700067281

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №5094688 считать недействительным.

УНП 100122726

■ Сацыяльны клопат

ПРАДУКТЫ НА ДОМ І ЎВАГА

Як прафсаюзы падтрымліваюць пажылых

Яшчэ ў 2015 годзе Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, БРСМ і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў падпісалі пагадненне, каб разам павышаць узровень сацыяльнай абароненасці пажылых людзей, весці работу па грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Падчас сустрэчы прадстаўнікі названых арганізацый абмеркавалі вынікі гэтага года і планы на наступны.

— На прафсаюзныя і маладзёжныя аб'яднанні ўскладзена адказнасць за падтрымку пенсіянераў, якія раней працавалі на прадпрыемствах. Людзі не павінны заставацца ў адзіноце, важна, каб яны атрымлівалі дапамогу — маральную і матэрыяльную, — адзначыў **старшыня савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў Анатоль АДОНЬЕЎ.** — Цяпер маладзёжныя валанцёрскія атрады дапамагаюць пажылым падрыхтавацца да зімы — прывозяць ім на дом прадукты, закупляюць лекі.

Нормы па падтрымцы сталых грамадзян уключаюць у калектыўныя дагаворы. Яны прадугледжваюць адрасныя выплаты, ручэнне падарункаў да свят і юбілеяў, вырашэнне пытанняў аздараўлення і лячэння, апрацоўку прысядзібных участкаў і многае іншае.

— Наш прафсаюз налічвае 1014 пенсіянераў, 31 з якіх — ветэран вайны. У калектыўным дагаворы мы прадугледзелі шмат пунктаў па сацыяльнай дапамозе гэтай катэгорыі, — расказвае **старшыня прафкама прадпрыемства «Керамін» Аляксандр КУРЧЫЦКІ.** — Так, калі чалавек выходзіць на пенсію, яму выплачваецца выхадная дапамога — адна з паловай мінімальнай заработнай платы за кожны адпрацаваны на прадпрыемстве год. Амаль кожны месяц мы арганізуем вечары сустрэч ветэранаў (перапынак робім толькі на дачны сезон), па святах ладзім канцэрты.

Яшчэ адзін кірунак сумеснай работы — захаванне і аднаўленне культурна-гістарычнай спадчыны, святыняў і духоўных каштоўнасцяў. На працягу многіх гадоў прафсаюзы сумесна з працоўнымі калектывамі, моладдзю і ветэранамі прыводзяць у парадак помнікі, мемарыялы, месцы пахаванняў. Налета, акрамя працягу ўжо традыцыйных праектаў «Кветкі Вялікай Перамогі», «Захаваем памяць на вякі», «Адзінокім ветэранам наш клопат», плануецца правесці памятныя мерапрыемствы да 75-годдзя Хатынскай трагедыі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Заробкі выплацяць поўнасцю

Задача — ліквідаваць запазычанасці па заработнай плаце ў сталіцы

Яе паставіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА на аператыўнай нарадзе ў Мінгарвыканкаме. Такое патрабаванне звязана ў тым ліку з навагоднімі і калядамі святамі, якія набліжаюцца.

Па стане на 24 лістапада ў Мінску 22 арганізацыі мелі цяжкасці з выплатай заробку за кастрычнік. Агульная сума запазычанасці — 4,6 млн беларускіх рублёў. Пра гэта паведаміла **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ.** Яна адзначыла, што «адпаведная інфармацыя перададзена ў Мінскае гарадское ўпраўленне дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Акрамя таго, органамі пракуратуры ў сувязі з выяўленымі фактамі штомесяц прымаюцца захады». Дарэчы, па выніках студзеня — кастрычніка 2017 года намінальны сярэдні заробак у сталіцы знаходзіцца на ўзроўні 1110,6 беларускага рубля.

Наталля Качанава звярнула ўвагу таксама на неабходнасць маніторынгу цэн у Мінску і недапушчэння іх неапраўданага росту.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

ТОНКАЯ РАБОТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каля 200 замежных гасцей, у тым ліку лектары з Японіі, Францыі, Італіі, Бразіліі, абмяняюцца на з'ездзе вопытам, абмяркуюць дасягнутыя вынікі. Прадстаўнікі Міжнароднага таварыства па дзіцячай нейрахірургіі правядуць афіцыйную школу, якая з'яўляецца асноўнай пляцоўкай па навучанні спецыялістаў гэтай галіны медыцыны ў самых розных краінах. Сёлета такія школы былі праведзены ў Аргенціне, Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, Кітаі і вось — у Беларусі.

Наша краіна будзе прадстаўлена на з'ездзе некалькімі дакладамі, прысвечанымі праведзенай рабоце. Як паведамляе **кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі, галоўны пазаштатны дзіцячы нейрахірург Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Міхаіл ТАЛАБАЕЎ,** за тры гады ў цэнтры прааперыравана звыш 30 дзяцей з эпілепсіяй — некаторыя з іх з-за прыступаў не маглі ні хадзіць, ні сядзець. Сёння гэтыя пацыенты нават не прымаюць супрацьсутаргавыя лекі. Айчынны вопыт хірургічнага лячэння эпілепсіі быў прадстаўлены на сёлетнім Еўрапейскім кангрэсе нейрахірургаў у Венецыі. Асвоены ўжо і аперацыі, падчас якіх пацыент знаходзіцца ў свядомасці, без агульнага наркозу, з прымяненнем толькі мясцовай анестэзіі. Метад дазваляе выдаліць пухліну ў галаўным мозгу з мінімальнай рызыкай развіцця парушэнняў. Сёлета такія ўмяшанні паспяхова былі праведзены пяці падлеткам 13—16 гадоў. Развіваецца і неанатальная нейрахірургія для неданошаных немаўлят вагой ад 1 кг. Новая для нас пакуль тэма — нейрахірургія плода, магчымасць карэкцыі некаторых паталогій унутрывантробна, але і ёю пачынаюць займацца нашы спецыялісты.

Штогод у цэнтры дзіцячай нейрахірургіі пралечваецца каля 1,5 тысячы пацыентаў, выконваецца каля 600 аперацый, праводзіцца каля 12 тысяч кансультацый па экстраннай дапамозе. Нейрахірургія займае сёння асаблівае месца сярод высокатэхналагічных метадаў лячэння, бо аперацыі на цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэме выконваюцца толькі тады, калі іншыя метады лячэння неэфектыўныя або няздольныя захаваць якасць жыцця. Плануючы аперацыю, нейрахірург думае не толькі аб выдаленні пухліны, але і аб тым, каб гэта дапамагло заставацца чалавеку паўнавартасным. А некалькі гадоў таму пры такой сур'ёзнай паталогіі, як пухліна цэнтральнай нервовай сістэмы, галоўным было выдаленне злаякаснага наваўтварэння, а не тое, якім пасля будзе жыццё гэтага пацыента...

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Кітай выбраў Канарскія астравы для міжкантынентальнай «тэлепартацыі»

«Кітайскія ведамствы, якія кіруюць навукай, рыхтуюць эксперымент з удзелам сваёй краіны і Канарскіх астравоў — выпрабаванні квантавай перадачы інфармацыі», — паведамляе ABC. «А менавіта, будзе ажыццёўлены эксперымент, каб высветліць, наколькі надзейнымі і сакрэтнымі могуць быць міжкантынентальныя камунікацыі», — гаворыцца ў паведамленні. Гэту інфармацыю пацвердзіў аўстрыйскі вучоны Антон Цайлінгер, які дзесяць гадоў таму ўжо паспяхова правёў падобны эксперымент паміж Тэнэрыфэ і Ла Пальмай. Выданне каментуе: «Такім чынам, Іспанія дзякуючы Канарам выходзіць у авангардзе навуковых дасягненняў у сферы сувязі, заснаванай на квантавай фізіцы. Сутнасць метаду ў тым, што дзве элементарныя часціцы, якія з'яўляюцца «заблытанымі» (гэта значыць іх квантавыя станы аднолькавыя), захоўваюць узаемасувязь на любой адлегласці». Эксперыменты Кітая на Канарскіх астравах будуць заснаваныя на феномене «заблытаных фатонаў». Па прагнозах выдання, праз 10 гадоў тэхналогіі квантавай сувязі будуць выкарыстоўвацца банкамі, урадамі і міжнароднымі арганізацыямі для перадачы інфармацыі, якую не ў сілах перахапіць шпіёны. Цайлінгер мяркуе, што ў наступныя 20 гадоў тэхналогія квантавай сувязі распаўсюдзіцца ва ўсім свеце і можа зрабіцца «новым квантавым інтэрнэтам».

З новага года ў Расіі запрацуе сістэма tax free

Змены, унесеныя ў Падатковы кодэкс, дазволяць ўвесці ў Расіі сістэму tax free. Яна мае на ўвазе вяртанне замежнікам падатку на дабаўленую вартасць пры вывазе тавараў з краіны. Закон уступіць у сілу 27 снежня, але вяртанне ПДВ пачнуць ажыццяўляць з 1 студзеня 2018 года, пасля пачатку новага падатковага перыяду. Скарыстацца падаткам па законе змогуць грамадзяне дзяржаў, якія не ўваходзяць у Еўразійскі эканамічны саюз. Яны змогуць разлічваць на кампенсацыю, роўную суме ПДВ у памеры 18% за выключэннем камісіі аператара сэрвісу. Пры гэтым сума пакупкі, як удакладняецца ў дакументе, павінна складаць не менш за 10 тысяч расійскіх рублёў з улікам падатку.

Атрымаць вяртанне падатку замежныя грамадзяне змогуць на працягу трох гадоў з моманту куплі тавараў пры ўмове іх вывазу на працягу трох месяцаў з дня набыцця.

У Індыі запускаюць вытворчасць самага таннага электракара ў свеце

Індыйская кампанія Tata Motors абвясціла аб перавыпуску свайго аўтамабіля Nano, які атрымае электрычную сілавую ўстаноўку і стане самым танным электракарам у свеце, паведамляе «ВладТайм».

Па даных прэс-цэнтра вытворцы, інжынеры Tata будуць супрацоўнічаць з канструктарамі адной з мясцовых кампаній, якія створаць электроніку для навінкі. Паведамляецца, што запас ходу электрычнай Tata Nano на адной зарадцы складае 200 км.

Першую партыю з 350 электрамабіляў, заказаную мясцовым урадам, Tata павінна вырабіць ужо ў гэтым годзе. Акрамя таго, індыйскія электракары прададуць таксапаркам, а таксама фірмам Uber і Ola, з якімі ўжо падпісаны адпаведныя пагадненні. У прыватнасці, Ola атрымае 400 электрамабіляў у 2018 годзе, паведамляецца ў публікацыі.

Кошт электрычнай версіі Tata Nano пакуль не называецца, але з улікам таго, што ў 2009 годзе звычайная версія прапаноўвалася за 2500 даляраў, журналісты мяркуюць, што навінка будзе каштаваць танней за канкурэнтаў на сусветным рынку электрамабіляў.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№11 (42)

■ Эксклюзіў

Сапраўдная гісторыя першага падраздзялення крымінальнага вышуку

ГОД ЗАСНАВАННЯ — 1917, МЕСЦА — ВІЦЕБСК

Сёлетні юбілейны год беларускай міліцыі азнаменаваны таксама і знакавай датай у гісторыі яе вядучай аператыўнай службы — крымінальнага вышуку. Як вядома, ён вядзе свой адлік ад 5 кастрычніка 1918-га, калі калегія НКУС РСФСР зацвердзіла адпаведнае палажэнне. Але дакументы, якія мне апошнім часам удалось адшукаць у архівах, сведчаць, што крымінальны вышук як спецыялізаваны дзяржаўны орган з дадзенай назвай упершыню з'явіўся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў 1917-м.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў былой Расійскай імперыі, у склад якой уваходзіла тэрыторыя Беларусі, пачаўся працэс арганізацыі новых органаў аховы грамадскага парадку — «народнай міліцыі з выбарным начальствам, падначаленым органам мясцовага самакіравання». Структуры міліцыі зазвычай фарміраваліся са структур і кадраў паліцыі, часцей шляхам простага перайменавання. Вялікая ўвага ўдзялялася аднаўленню дзейнасці на месцах вышуковых аддзяленняў, якія раней знаходзіліся ў падпарадкаванні 8-га справаводства Дэпартамента паліцыі МУС. У Мінску вышуковае аддзяленне было перайменавана ў крымінальнае аддзяленне гарадской міліцыі. А вось у Віцебску пераўтворанаму вышуковаму органу прысвоілі назву — «Упраўленне крымінальнага вышуку ў горадзе Віцебску». Пра гісторыю яго ўзнікнення і пойдзе гаворка.

Працэс стварэння ў старажытным беларускім Віцебску новага вышуковага органа быў фактычна запачаткаваны тэлеграмай таварыша (цяпер — намесніка) міністра ўнутраных спраў Часовага ўрада Расіі князя Сяргея Урусава, накіраванай 8 красавіка 1917 года віцебскаму губернскаму камісару. Падаём яе тэкст з захаваннем арыгінальнай лексікі: *«Существовавшие в некоторых местностях сыскные отделения, ведающие уголовным розыском, предположено не упразднять, а передать в ближайшем будущем Министерству Юстиции. Поэтому Вам надлежит озаботиться, чтобы учреждения эти, столь необходимые для обеспечения гражданам безопасности, возобновили свою деятельность как можно скорее»*. З грыфам *«спешно»* копія тэлеграмы з канцылярыі губернскага камісара дасылаецца прокурору Віцебскага акруговага суда Б. С. Рэпнінскаму з просьбай «не адмовіць у арганізацыі крымінальнага вышуку з абноўленым складам служачых» і паведаміць «аб далейшым».

6 мая 1917 года Б. С. Рэпнінскі накіроўвае ліст у зацікаўленыя мясцовыя органы, у якім абгрунтоўвае неабходнасць рэарганізацыі міліцыі і прапаноўвае «выбраць прадстаўніка для ўдзелу ў пасяджэннях па выпрацоўцы палажэння аб Упраўленні крымінальнага вышуку». У дадзеным лісце, у прыватнасці, адзначалася, што агульная міліцыя, да якой перайшлі «абавязкі» вышуковых аддзяленняў, не валодае ў гэтым дачыненні спецыяльнымі ведамі і дастатковым вопытам і не ў сілах змагацца з усё большым ростам злачыннасці, і яе «нежыццяздольнасць як судовай паліцыі стала, відаць, агульнапрызнанай». 23 і 26 мая 1917-га адбыліся пасяджэнні асобай нарады, на якіх і былі разгледжаны пытанні арганізацыі Упраўлення крымінальнага вышуку. Асобая нарада *«определила»* прысвоіць навастворанаму вышуковаму органу назву «Упраўленне крымінальнага вышуку ў горадзе Віцебску» і накіравала віцебскаму губернскаму камісару А. А. Валковічу праекты адпаведнай пастановы, палажэння аб гэтым упраўленні і яго штатным раскладзе, якія і зацвердзіў губернскі камісар 3 чэрвеня 1917 года.

Начальнікам Упраўлення крымінальнага вышуку ў Віцебску стаў Фіёгній Афінагенавіч Дунаеў, былы начальнік вышуковага аддзялення Дзвінскага гарадскога паліцэйскага ўпраўлення, а яго памочнікам — Георгій Францавіч Шыманоўскі.

На думку вядомага беларускага навукоўца доктара гістарычных навук, прафесара права, прафесара Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь Аляксея Вішнеўскага, вышэйпададзеныя архіўныя звесткі фактычна сведчаць пра новую дату заснавання крымінальнага вышуку — 3 чэрвеня 1917 года, якая знаходзіцца ў лагічнай адпаведнасці з часам заснавання беларускай міліцыі 4 сакавіка 1917-га.

Юрый КУР'ЯНОВІЧ

■ Пытальнік

«Ці сапраўды ДАІ Мінска аказвае паслугу пробнага тэсціравання ведаў ПДР?»

Алег, *г. Мінск.*

Адказвае старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ МУС Ганна БАНАДЫК:

Цяпер ва ўсіх рэгіёнах Беларусі экзаменацыйнымі, рэгістрацыйна-экзаменацыйнымі падраздзяленнямі Дзяржаўтаінспекцыі аказваецца паслуга па забеспячэнні грамадзянам магчымасці праходжання пробнага тэсціравання ведаў Правілаў дарожнага руху. Тэсціраванне ажыццяўляецца з выкарыстаннем аўтаматызаваных сістэм і адмыслова распрацаваных білетаў з абноўленымі пытаннямі па Правілах дарожнага руху.

Тарыфы на аказанне такой паслугі ўсталёўваюцца ГУУС Мінгарвыканкама, УУС аблвыканкамаў самастойна, зыходзячы з попыту і выдаткаў на аказанне гэтай паслугі.

* * *

«Дапамажыце разабрацца: якія зімовыя шыны адпавядаюць патрабаванням ДАІ?»

Ганна, *г. Слуцк.*

Адказвае старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Кастрычніцкага раёна Мінска Вікторыя ЦАРУК:

Зімовыя шыны механічных транспартных сродкаў, прызначаныя для эксплуатацыі на абледзянелым ці заснежаным дарожным пакрыцці, павінны быць пазначаныя маркіраваным знакам у выглядзе горнай вяршыні з трыма пікамі і са сняжынкай унутры яе альбо знакамі «M + S», «M & S», «M S» або «All Seasons» і мець рэшткавую вышыню малюнка пратэктара не менш за 4 мм.

За несвоечасовае абсталяванне транспартных сродкаў зімовымі шынамі прадугледжана адміністрацыйная адказнасць па арт. 18.22 ч. 5 КоАП Рэспублікі Беларусь, што цягне за сабой пакаранне ў выглядзе папярэджання або штрафу ў памеры да 0,5 базавай велічыні. Калі ж на транспартным сродку ўстаноўлены зімовыя шыны, але рэшткавая вышыня малюнка пратэктара складае менш за 4 мм, такі транспартны сродак будзе лічыцца няспраўным, і яму забараняецца ўдзельнічаць у дарожным руху

■ Тэхналогіі

ШМАТФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ І АБАРОНЕНАСЦЬ

ЯКІМІ БУДУЦЬ НОВЫЯ БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

Зараз у Беларусі рэалізуецца маштабны праект па ўкараненні ідэнтыфікацыйных дакументаў новага тыпу. Па папярэдніх даных, атрымаць першы біяметрычны пашпарт і ID-карту можна будзе ўжо ў студзені 2019 года. Каб разабрацца ў новаўвядзенні, мы пагутарылі з часова выконваючым абавязкі намесніка начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Паўлам ХРЫШЧАНОВІЧАМ.

Машына на пашпартным кантролі

Дарэчы, пытанне ўкаранення біяметрычных тэхналогій разглядалася ўжо досыць даўно. Яшчэ ў 2010 годзе распрацоўваўся першы праект, які, праўда, не ўдалося давесці да канца. Вядома, падобная ініцыятыва патрабуе сур'ёзных фінансавых укладанняў.

Неабходнасць у навацыях узнікла з-за таго, што ў многіх сусветных дзяржаў дакументы, якія сведчаць асобу, ужо на парадак больш прасунутыя. Нават на постсавецкай прасторы мы апошняя дзяржава, якая яшчэ не ўкараніла біяметрычную тэхналогію. Яна дазваляе ствараць дакументы са значна больш высокай ступенню абароны, выпадкі падроблівання якіх адзінкавыя ў свеце. На дадзены момант распрацаваны папярэдні варыянт праекта.

Адна з галоўных змен — тое, што дакументаў зараз будзе два: для карыстання ўнутры краіны і для выезду за мяжу. Другую функцыю возьме на сябе новы пашпарт. Галоўная старонка з персанальнай інфармацыяй будзе зроблена з полікарбанату і забяспечана шматлікімі галаграмамі, астатнія старонкі будуць з паперы, але таксама з высокай ступенню абароны. Мяркуецца, што пашпарт будзе цалкам на англійскай мове, у яго не будуць уносіцца даныя аб рэгістрацыі ці сямейным становішчы, як цяпер, — гэта агульнасусветная практыка. Аднак старонка з назвай «Іншыя адзнакі» захаваецца: туды будуць ставіць пячатку аб выездзе за мяжу на пастаяннае месца жыхарства.

Увядзенне новай сістэмы павінна значна скараціць час праходжання памежнага кантролю. Магчыма, у будучыні правяраць грамадзяніна, які выязджае за мяжу, будзе спецыялізаваны камп'ютар — так званая электронная брама, а не жывыя людзі. Да счытвальнай прылады трэба будзе прыкласці пашпарт, каб яна параўнала ваш твар з выявай у дакуменце. Аднак гэта не значыць, што памежная служба знікне — яе супрацоўнікі ў выпадку неабходнасці будуць праводзіць дадатковую праверку.

Зараз ідзе падрыхтоўка да тэндару на закупку абсталявання і праграмнага забеспячэння. У свеце ёсць тэндэнцыя, што краіны з насельніцтвам менш за дзесяць мільёнаў вырабляюць дакументы за межамі сваёй дзяржавы, на месцы іх толькі персаналізуюць. Па словах Паўла Хрышчановіча, у Беларусі такой практыкі адназначна не будзе: увесь дакумент будзе збірацца і персаналізавацца толькі на тэрыторыі нашай краіны. Адзінае, што давядзецца закупляць, — чып з антэнай, які будзе ўстаноўлены ў вокладку: такое абсталяванне вырабляюць усяго некалькі фірмаў у свеце. Тое ж самае ў ID-карце, толькі ў ёй будзе два чыпы: кантактавы і бескантактавы. Пакуль яшчэ вядзецца абмеркаванне, ці патрэбны менавіта два чыпы або можна зрабіць дуальны інтэрфэйс — адзін чып, але ўнутры, умоўна кажучы, ён будзе падзелены напалам.

Па даведкі, не выходзячы з дому

ID-карта будзе адзіным на тэрыторыі краіны дакументам, які пацвярджае асобу грамадзяніна. Гэта значыць з новым пашпартам нельга будзе, напрыклад, прыйсці ў салон сотавай сувязі, каб аформіць дагавор, — для гэтага прызначана выключна карта. Выдавацца яна будзе як грамадзянам Рэспублікі Беларусь, так і замежнікам, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі краіны: грамадзянам іншых дзяржаў і асобам без грамадзянства — гэта тры розныя ўзоры.

Карта будзе змяшчаць тры дадаткі. Першы — ідэнтыфікацыйны. Гэта ўсе даныя аб грамадзяніне — асабісты нумар, прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства і гэтак далей. Другі — крыптаграфічны, які адказвае за лічбавы электронны подпіс. Трэці — ICAO, адпаведны Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі. Ён будзе і ў пашпарце, і ў картцы, можна сказаць, што яго закладваюць на будучыню: калі Беларусь падпіша адпаведныя дагаворы з замежнымі дзяржавамі, то па ID-карце можна будзе таксама выязджаць за мяжу, напрыклад у Расію ці Украіну.

Сумесна з біяметрычным праектам, за які адказваюць Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства фінансаў, рэалізуецца яшчэ адзін вялікі праект — Беларуская інтэграваная сэрвісна-разліковая сістэма, або БІСРС. Гэты праект курыруе Міністэрства сувязі, ён вельмі шырокі, у хуткім часе аб'явяць тэндар на выбар IT-кампаніі, якая гэты працэс запусціць.

У далейшым два праекты павінны злучыцца. Выглядаць гэта будзе так: МУС выдасць картку, запісаўшы на яе электронны лічбавы подпіс, грамадзянін уставіць яе ў спецыяльную счытвальную прыладу, адкрые праграму БІСРС і зможа выконваць адміністрацыйныя працэдуры, нават не выходзячы з дому. Напрыклад, так можна будзе заказаць даведку ў службе «Адно акно», якую потым прышлюць на электронную пошту.

Зараз дзейнічае міжведамасная група, куды ўваходзяць шэраг арганізацый, міністэрстваў і ведамстваў, якая абмяркоўвае, што трэба запісваць на картку. Пакуль прыйшлі да высновы, што нічога. Чалавек сам з прапанаванага пераліку будзе выбіраць, якія праграмы яму патрэбны. З часам пералік будзе пашырацца — усё аўтаматычна, у так званым электронным воблаку.

Магчыма, напрыклад, што на картку можна будзе запісаць пенсійны дадатак, і цяперашнія пенсійныя пасведчанні знікнуць з нашага абароту. А вось выкарыстоўваць ID-карту ў якасці банкаўскай не атрымаецца. Таму што на любых картках, якія маюць банкаўскія дадаткі, павінны быць іх рэквізіты і адзнакі. Але ў той жа час падобныя знакі не могуць стаяць на ідэнтыфікацыйным дакуменце. Пры гэтым праз сістэму БІСРС, дзякуючы прывязцы да рахунку, можна будзе ажыццяўляць пэўныя плацяжы. Як пасведчанне кіроўцы картка таксама дакладна не будзе выкарыстоўвацца, паколькі згодна з нашым заканадаўствам яго могуць канфіскоўваць за парушэнні.

На самой картцы звестак размешчана будзе няшмат. Напрыклад, не будзе інфармацыі аб рэгістрацыі: у адваротным выпадку давялося б мяняць картку кожны раз, калі змяняецца месца жыхарства, таму ад ідэі адмовіліся.

Замест пашпартнага стала — у міліцыю

Тэрмін дзеяння як пашпарта, так і ID-карты будзе складаць дзесяць гадоў. Адно з адным яны ніяк не звязаныя, таму атрымліваць іх можна асобна. Больш за тое, калі карту павінен будзе атрымаць кожны, то пашпарт — толькі па меры неабходнасці. Аднак гэта не значыць, што з першага студзеня 2019 года



Узор біяметрычнага пашпарта.

цяперашнія пашпарты перастануць быць сапраўднымі. Мяркуецца, што імі можна будзе карыстацца да заканчэння тэрміну дзеяння. Але калі вы зразумееце, што ID-карта вам патрэбна, вы зможаце яе атрымаць, не чакаючы гэтага моманту. У выпадку страты, патэлефанаваўшы ў спецыялізаваны кол-цэнтр, карту можна будзе заблакаваць.

Для выезду за мяжу і звычайны, і біяметрычны пашпарты будуць мець раўназначнае хаджэнне. Аднак ёсць адзін момант: Еўрасаюз ужо не раз заяўляў, што збіраецца дазволіць уезд толькі па біяметрычных пашпартах, аднак канкрэтная дата новаўвядзення пакуль не называлася.

Заяўлены папярэдні кошт пашпарта — тры базавыя велічыні, ID-карты — адна базавая. Счытвальную прыладу кожны пры неабходнасці будзе набываць самастойна. Дарэчы, яна зусім недарагая, на адным з кітайскіх сайтаў яе можна знайсці за 10 рублёў. Акрамя таго, адно з беларускіх прадпрыемстваў цяпер працуе над стварэннем уласнага счытвальніка.

В случае если Победители не явились за получением Призов 1, 2, 3 и Главным призом до 18 декабря 2017 г. включительно согласно п. 9 настоящих Правил, то право на получение Призов 1, 2, 3 и Главного приза переходит к резервным победителям, определенным при розыгрыше. Резервные победители извещаются о выигрыше в течение 1 (одного) дня со дня признания их Победителями письмами, отправленными на адрес проживания, указанный при регистрации карточки участника рекламной игры, а также посредством звонка по телефону на номер, указанный при регистрации карточки участника. Призы 1, 2, 3 резервные победители смогут забрать с 19 по 21 декабря 2017 г. включительно с 9.00 до 20.00 в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 12А, пом. 6, каб. 5.
Главный приз рекламной игры резервный победитель сможет получить по адресу: г. Минск, Партизанский проспект, 150А с 19 по 21 декабря 2017 года с 09.00 до 20.00, предварительно созвонившись с Организатором по телефону +375 44 514 57 75. При себе иметь паспорт, карточку участника рекламной игры с выигравшим номером и чек (чеки), подтверждающие покупку.
Организатор при выдаче Призов 1, 2, 3 и Главного приза Победителям Рекламной игры признается налоговым агентом и несет ответственность за соблюдение действующего налогового законодательства Республики Беларусь. Выдача Главного приза производится путем передачи Главного приза Победителю за минусом возмещения подоходного налога, удержанного из денежного вознаграждения. Подоходный налог перечисляется в бюджет РБ в соответствии с законодательством.
11. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.
Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры, а также на сайте momo-center.by. Результаты розыгрыша призов будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее 22 декабря 2017 года, а также на сайте momo-center.by.
12. Общие условия рекламной игры.
Участвуя в рекламной игре, ее участники соглашаются с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии могут быть использованы в рекламных целях Организатора без уплаты какого-либо вознаграждения участникам в рамках данной рекламной игры. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в рекламной игре.
В случае отказа участника от получения приза или неполучение приза в установленные в настоящих правилах сроки приз остается у Организатора и используется им по своему усмотрению.
Результаты игры будут являться окончательными и не могут быть оспорены.
Участники рекламной игры, претендующие на получение приза, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые организатором рекламной игры для получения призов.
Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору рекламной игры по адресу: 220073, г. Минск, а/я 39.
Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.
Приз получает участник розыгрыша, имя которого указано в карточке участника, который оказался выигрышным. Участник вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.
Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие участников с настоящими правилами рекламной игры.
Телефон информационной линии: +375 44 514 57 75.
Время работы информационной линии: с 1 декабря по 22 декабря 2017 года с 13.00 до 16.00 по будним дням и с 10.00 до 12.00 по выходным.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №3155 от 20 ноября 2017 года выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ПРАСЦЕЙ, ЧЫМ БАНСАЙ:

расліны з незвычайнымі сцёбламі

Фарміраванне сцябла — гэта магчымасць ператварыць класічную расліну ў эксклюзіўны экзэмпляр. Ёсць і такія культуры, якія не патрабуюць фарміроўкі

Бансай — гэта мастацтва вырошчвання дрэў у мініяцюры. Завесці такія незвычайныя расліны ў сябе дома, без сумнення, мараць многія. Але каштуе бансай нятанна, самім вырасціць яго складана, ды і догляд такому «карліку» патрэбен асаблівы. Зусім іншая справа, калі «ператварыць» у дрэва, напрыклад, звычайны фікус Бенджаміна. Ёсць і іншы варыянт — завесці экзоты — і ніякай фарміроўкі не спатрэбіцца.

Фікус на штамбе

Фікус Бенджаміна — расліна, якая выдатна падыходзіць для фарміроўкі адзіночнага ствала. У яго падатлівыя парасткі, з якіх лёгка сфарміраваць зялёную «шапку». Да таго ж культура вельмі непераборлівая і хутка расце. Для большага эфекту ствалу фікуса можна надаць форму спіралькі.

Вельмі арыгінальна глядзіцца ствол у выглядзе «коскі». Яе можна «сплесці», калі ў адзін гаршчок высадзіць адразу тры маладыя фікусы. У такім узросце іх гнуткія ствалы лёгка гнуцца і не ламаюцца.

Калі ў вас шмат чаранкоў расліны, можна высадзіць іх па крузе на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго і па меры росту сфарміраваць з іх рашотку. Атрымаецца полы ўнутры сеткаваты ствол. Увянчае «збудаванне» капа зеляніны.

Пакаёвы бамбук

Гэту расліну часта называюць бамбукам, хоць на самай справе гэта драцэна Сандэра. Яна непатрабавальная, можа расці як у зямлі, так і ў вадзе. Як і ў выпадку з фікусам, з некалькіх асобнікаў гэтай драцэны можна «сплесці» адну расліну з рашэцістым сцяблом.

Наогул, гэта вельмі падатлівая расліна, з якой можна «скруціць» усё, што пажадаеце. Нават «ялінкі».

Драцэна Сандэра добрая і з абсалютна прамымі стволікамі. Проста звяжыце некалькі такіх «бамбукаў» у пучок, і атрымаеце «дрэва» з тоўстым ствалом і зялёнай кронай.

Фарміроўка кроны ў таўсцянкі

Прыняць форму міні-дрэўца можа і таўсцянка. Грашовае дрэва — даволі папулярная расліна. Многія вераць, што знаходжанне гаршчэчка з гэтай культурай у кватэры абавязкова абяцае багацце. Наколькі гэта справядліва, ніхто не ведае. Але калі ўжо вы завялі таўсцянку, надайце ёй такі выгляд, каб яна прыцягвала да сябе ўвагу.

Незвычайнасці псеўдабансай можна дадаць, калі выбраць які-небудзь нестандартны выгляд расліны.

Адэніум — бансай для лянівых

Адэніум уяўляе сабой кусцік, які вельмі павольна расце, ці невялікае дрэўца з буйным мясістым ствалом. Патаўшчэнне ў ніжняй частцы ствала называецца каўдэксам, большая частка якога можа знаходзіцца пад зямлёй.

Паходзіць культура з засушлівых краін, там ёй якраз і патрэбна такое патоўшчанае сцябло — у ім назапашваецца вада і пажыўныя рэчывы. Такога кветкавага «вярблюда» яшчэ называюць ружай пустыні, таму што расліна вельмі прыгожа і багата цвіце. У перыяд распускання бутонаў адэніум выглядае непаўторна. Афарбоўка кветак можа вар'іравацца ад белай да цёмна-малінавай. Вырасціць адэніум у свойскім кветніку зусім не складана.

Міні-дрэва з налінаў

Яшчэ адна культура з патоўшчаным сцяблом — гэта налін (або бутэлькавае дрэва). У прыродзе гэта расліна вырастае вельмі высокай, а ў выглядзе пакаёвай культуры ўяўляе сабой дрэўца ў мініяцюры.

Маладая расліна вельмі падобная на цыбулю: з зямлі выступае цыбуліна, з якой расце «вадаспад» зеляніны. Па меры росту ствол расліны паступова выцягваецца, і налін становіцца падобным на дрэўца.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.02	16.54	7.52
Віцебск —	8.58	16.36	7.38
Магілёў —	8.52	16.43	7.51
Гомель —	8.41	16.48	8.07
Гродна —	9.16	17.10	7.54
Брэст —	9.09	17.18	8.09

Месяц

Першая квадра
26 лістапада.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Васіля, Віктара, Івана, Мацвея, Мікалая, Міхаіла, Сцяпана, Фёдара.*
К. *Дар'і, Маргарыты, Блажэя, Сатурніна, Сцяпана, Фрэдэрыка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

29 ЛІСТАПАДА

1817 год — створана таемнае студэнцкае таварыства філаматаў (аматары навукі, ведаў) у Віленскім універсітэце. Існавала да 1823 года.

1830 год — у Беларусі, Польшчы і Літве пачалося паўстанне супраць царскай Расіі за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. 30 лістапада паўстанцы авалодалі Варшавай. Расійскія войскі вымушаны былі адступіць з Варшавы, а пазней і з тэрыторыі ўсёй Польшчы. Значная частка іх сканцэнтравалася ў Беларусі. У Варшаве быў сфарміраваны Часовы ўрад. У студзені—лютым 1831 года ў Беларусі і Літве быў створаны падпольны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. А ўжо ў сакавіку—красавіку паўстанне ахапіла Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Дзісненскі паветы, у кожным з іх ствараліся органы ўлады, якія праводзілі рэкруцкі набор у войска. Да канца мая 1831 года ў Віленскай і Мінскай губернях паўстанне было задушана, але працягвалася ў Гродзенскай губерні, што перашкаджала расійскім войскам наступаць на Польшчу. У чэрвені—ліпені 1831 года паўстанцкія ачагі разгарэліся ў Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім, Навагрудскім паветах, а таксама на тэрыторыі Магілёўскай і Віцебскай губерняў. У жніўні 1831-га паўстанне ў Беларусі і Літве пацярпела паражэнне, хоць асобныя атрады дзейнічалі і ў верасні.

1857 год — нарадзіўся (Віцебская губерня) Аляксандр Уладзіміравіч Жыркевіч, пісьменнік, ваенны юрыст, калекцыянер. У 1888 годзе скончыў Пецярбургскую ваенна-юрыдычную акадэмію. Служыў у Віленскім ваенна-акруговым судзе. З 1908 года — генерал-маёр і ваенны суддзя. У знак пратэсту супраць увядзення смяротнага прысуду для палітычных зняволеных у лістападзе 1908 года падаў у адстаўку. Пісаў апавяданні і вершы, якія публікаваў у часопісе «Вестник Европы» і іншых выданнях. Калекцыяніраваў творы расійскіх і замежных мастакоў, якія ў 1922 годзе перадаў у музей Сімбірска. Архіў Жыркевіча (8,5 тысяч старонак дзённіка, амаль 5 тысяч лістоў і фотаздымкаў) захоўваецца ў музеі Л. Талстога ў Маскве. Памёр у 1927 годзе.

1947 год — нарадзілася (в. Лясец Калінкавіцкага раёна) Соф'я Шах, беларуская паэтэса. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1990 года. Аўтар паэтычных кніг «І не пакіне спадзяванне», «Пад высокай лагодай нябёс», «Наш двор», «Ад імгнення — да стагоддзя» і іншых.

1947 год — на II сесіі Генеральнай асамблеі ААН была прынятая рэзалюцыя аб падзеле Палесціны на арабскую і яўрэйскую дзяржавы і выдзяленні горада Іерусаліма ў самастойную адміністрацыйную адзінку.

Было сказана

Ніна МАЦЯШ, паэтэса:
«І перамог няма без паражэння,
Без неспакою цішы не знайсці».

УСМІХНЕМСЯ

На думку людаеда, камп'ютар ніколі не зможа замяніць чалавека.

— Можаце ў двух словах ахарактарызаваць вашага жаніха?

— Затое не п'е.

Сын прафесара філалогіі і заслужанай настаўніцы па беларускай мове ўтрымліваў Дзядулю Мароза на працягу трох гадзін, расказваючы яму вершы.

— Доктар, жыццё стала нейкае шэрае, аднастайнае, нясмачнае. Карацей, страціла ўсякі сэнс.

— Ну, галубок, вось тут у мяне віскі, вось тут ром, тэкіла ёсць. З лаймам.

— Добры вы псіхолаг, душэўны. Я да вас яшчэ прыйду.

У банку:

— Якую суму вы хочаце ўзяць у крэдыт?

— 100 тысяч рублёў.

— Якія гарантыі можаце даць?

— Ведаеце... У дзяцінстве я заўсёды вяртаў рэшту бацькам.

Малюнак Паўла ГАРАДЦОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ ПАВЕДАМЛЕННЯЎ ПРА ПАМЕРЫ ПРАЦЯГЛАСЦІ ТЭЛЕФОННЫХ РАЗМОЎ ТЭЛ./ФАКС: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4424.

Нумар падпісаны ў 19.30 28 лістапада 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Мясцовае самакіраванне

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

29 лістапада 2017 г. №45 (429)

стар. 2

Прыватнаму гандлю развязалі рукі

стар. 6

Калі зачыняюць краму...

стар. 8

Выхаванне сабакі... і чалавека

ТЭМА ТЫДНЯ

СПАКОЙНА І ЎЗВАЖАНА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Якой павінна быць дзяржаўная палітыка ў дачыненні да зваротаў грамадзян

НАПІСАЦЬ кіраўніку дзяржавы, звярнуцца ў Адміністрацыю Прэзідэнта — такі варыянт вырашэння праблемы многія трымаюць «на запас», і ён лічыцца самым эфектыўным спосабам вырашыць пытанне. Некаторыя ж нават і не дзеляць свае звароты на істотныя і не вельмі — і адразу звяртаюцца па вышэйназваным адрасе.

стар. 4

ДАТА

СТО ГАДОЎ НА СЛУЖБЕ Ў ЛЮДЗЕЙ

Магілёўскія народныя абраннікі ў бліжэйшыя дні адзначаць стагадовы юбілей з дня заснавання гарадскога Савета дэпутатаў

Гэта адбудзецца ўжо 8 снежня. І народныя абраннікі Магілёва паставіліся да гэтай падзеі як заўсёды адказна. У выдавецтве «АмеліяПрынт» амаль скончана работа над багатым на рэдкія гістарычныя фотаздымкі і дакументы выданнем, прысвечаным стагадовай даце. Гэта працяг кнігі «Гісторыя Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў (1917—2014 гады)», якую тры гады таму пры дапамозе гарсавета дэпутатаў падрыхтаваў магілёўскі гісторык Міхаіл Рыскоў. Ён жа стаў аўтарам і новага выдання.

ФОТА З АРХІВАЎ

— Зроблены своеасаблівы летапіс Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў, іншымі словамі — гісторыі Магілёва, бо гэта, лічы, адно і тое ж, — кажа Міхаіл Рыскоў. — Дэпутаты заўсёды былі першымі на галоўных кірунках развіцця горада. У альбоме ўпершыню друкуюцца дзясяткі фатаграфій дэпутатаў Магілёўскага гарсавета, якія раней былі вельмі вядомыя ў Магілёве, а потым сталі цалкам забытыя. Прыйшлося добра папрацаваць у магілёўскіх архівах, каб аднавіць справядлівасць.

Сем раздзелаў уключаюць у сябе ўсе перыяды гісторыі гарадскога Савета. Усё пачынаецца з таго моманту, калі ў Магілёве знаходзілася апошняя стаўка цара. Ёсць унікальнае фота, дзе Мікалай II з цэсарэвічам Аляксеем сядзяць на лаўцы ў садзе на вале (цяперашні парк імя Горкага). Там ужо тады было электрычнае асвятленне.

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

БЕЗ АДМЕНЫ ДАРОЖНАГА ЗБОРУ

Спікер верхняй палаты наведаў Камітэт судовых экспертыз

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, наведаў Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз і азнаёміўся з асноўнымі напрамкамі яго работы. Старшыня Дзяржаўнага камітэта Андрэй ШВЕД расказаў пра матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае забеспячэнне органаў камітэта.

Падчас абмеркавання была адзначана зацікаўленасць Дзяржкамітэта ў сумеснай працы з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Выказана прапанова аб арганізацыі сустрэч, на якіх бакі маглі б абмеркаваць магчымасць рэалізацыі сумесных праектаў, у тым ліку за кошт сродкаў рэспубліканскага інавацыйнага фонду.

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэўся з калектывам Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Спікер верхняй палаты парламента адказаў на пытанні супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта. У прыватнасці, адзін з удзельнікаў сустрэчы пацікавіўся, ці плануецца ў Беларусі адмяніць дарожны збор. Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ў найбліжэйшы час такой меры не прадугледжана. Таксама прагучала пытанне, якое датычыцца правядзення ў Беларусі другіх Еўрапейскіх гульняў. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што ў нашай краіне створана сучасная спартыўная і гасцінічная інфраструктура, якая дазволіць дастойна прыняць спаборніцтвы такога ўзроўню.

ПЯТАЯ РЭСПУБЛІКА СТАНОВІЦЦА БЛІЖЭЙШАЙ

Мінск наведала група дружбы паміж парламентамі Беларусі і Францыі

Беларусь зацікаўлена ў сумесных праектах з Францыяй у сельскай гаспадарцы і біятэхналогіях. Пра гэта ішла размова на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіла МЯСНІКОВІЧА са старшынёй парламенцкай групы дружбы «Францыя — Беларусь» Нацыянальнага сходу Францыі Крыстафам ЛЕЖЭНАМ.

Падчас перагавораў абмяркоўваліся ўмовы паглыблення гандлёва-эканамічных, міжпарламенцкіх, гуманітарных сувязяў паміж дзяржавамі. У тым ліку прапанавана актывізаваць партнёрства ў навукова-тэхнічнай сферы. Беларусь зацікаўлена і ў сумесных інавацыйных праектах з Францыяй па такіх перспектыўных напрамках, як племянная справа, малочная і мясная жывёлагадоўля, ільнаводства, біятэхналогіі.

Падчас сустрэчы намесніка старшыні Савета Рэспублікі Мар'яны Шчоткінай з дэлегацыяй групы дружбы «Францыя — Беларусь» віцэ-спікер павіншавала Крыстафа Лежэна з прызначэннем у верасні гэтага года на пасаду старшыні групы дружбы і выказала надзею на працяг актыўнага міжпарламенцкага дыялогу, які з'яўляецца важным інструментам пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін. На думку намесніка старшыні Савета Рэспублікі, нашым краінам неабходна актывізаваць эканамічнае супрацоўніцтва, сувязі ў сферы развіцця турызму, стварэння сумесных вытворчасцяў.

АБАРАНІЦЬ ПРАВЫ ДЗЯЦЕЙ

Ірына Старавойтава ўзяла ўдзел у рабоце Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы. У ходзе пасяджэння была абмеркавана канцэпцыя законапраекта «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах».

Таксама Ірына Старавойтава як намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці ўдзельнічала ў пасяджэнні гэтай камісіі. Асаблівая ўвага была ўдзелена арганізацыі аказання дапамогі дзецям ранняга ўзросту з праблемамі ў развіцці, а таксама ўдасканаленню работы па паляпшэнні становішча падлеткаў і абароне іх правоў.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

МАШТАБ — АГУЛЬНАПЛАНЕТАРНЫ

У Мінск прыехала місія MAPS, якая выпрацоўвае рэкамендацыі для краіны па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР)

АСНОЎНАЯ задача экспертаў місіі — пошук спосабаў садзейнічання дзяржавам, а таксама слабых месцаў, якія варта выправіць на нацыянальным узроўні, каб палепшыць агульную карціну з дасягненнем МУР. На працягу пяці дзён спецыялісты праводзяць у краіне сустрэчы ў профільных дзяржаўных органах, каб прааналізаваць стартавыя ўмовы для дасягнення Мэт устойлівага развіцця. У выніку місія распрацоўвае для краіны дарожную карту, якая носіць рэкамендацыйны характар.

Злева направа: Ларыса БЕЛЬСКАЯ, Мар'яна ШЧОТКІНА, Санака САМАРАСІНХА, Беціна МЕНЭ.

Па словах нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намесніка старшыні Савета Рэспублікі Мар'яны Шчоткінай, Беларусь выбудавала нацыянальную архітэктуру кіравання МУР, куды ўваходзіць і Савет па ўстойлівым развіцці. Віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента адзначыла, што ў нашай краіне распрацаваны два стратэгічныя дакументы — Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2030 года і Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2016—2020 гады. У абодвух з іх у той ці іншай ступені ўлічаны крокі па дасягненні МУР. «Наша галоўная задача (Савета па ўстойлівым развіцці) — гэта ўкараненне паказчыкаў Мэт устойлівага развіцця ў рэспубліканскія, галіновыя, рэгіянальныя праграмы рознага ўзроўню і распрацоўка плана мерапрыемстваў, ці, іншымі словамі, дарожнай карты, у якую з розных праграм былі б зведзены ўсе мерапрыемствы па дасягненні Мэт устойлівага развіцця», — падкрэсліла нацыянальны каардынатар.

Мар'яна Шчоткіна адзначыла, што сістэма па дасягненні Мэт устойлівага развіцця была выбудавана з улікам нацыянальных асаблівасцяў. «Усё ж такі МУР — гэта мэты агульнапланетарнага маштабу. І тут у адзіночку працаваць ніхто не можа», — паведаміла віцэ-спікер верхняй палаты і дадала, што па гэтай прычыне ішла шчыльная работа разам з Міністэрствам замежных спраў.

Нацыянальны каардынатар таксама расказала пра структуру Савета па ўстойлівым развіцці. Гэта 32 намесніка міністраў і прадстаўнікоў рэгіянальных органаў. Работа Савета падзелена па чатырох асноўных сектаральных групах — сацыяльная палітыка, статыстычныя даныя, экалогія, эканоміка. Яе каардынацыю ажыццяўляюць адпаведныя дзяржаўныя органы. У краіне праведзены шэраг семінараў для прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і няўрадавых арганізацый, наладжана работа па інфармаванні грамадства.

Віцэ-спікер падкрэсліла, што Беларусь у частцы дасягнення Мэт устойлівага развіцця працуе па ўсіх напрамках. Пытанне знаходзіцца на кантролі кіраўніка дзяржавы. Мар'яна Шчоткіна выказала надзею, што ўзаемадзеянне з місіяй MAPS дазволіць больш эфектыўна і хутка прасоўвацца на гэтым шляху.

Пастаянны каардынатар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Беларусі Санака Самарасінха станоўча ацаніў работу, якую ўжо зрабіла наша краіна на шляху па дасягненні МУР: «Мы лічым, што Рэспубліка Беларусь ужо з'яўляецца і будзе надалей выдатным прыкладам для астатніх краін у плане дасягнення Мэт устойлівага развіцця».

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

ВЫЙГРАЦЬ АБО СТРАЦІЦЬ?

Ці пойдзе бізнес у вёску

Шэраг населеных пунктаў і тэрыторый Барысаўскага і Пухавіцкага раёнаў падпадаюць пад дзеянне Указа Прэзідэнта Беларусі ад 22 верасня №345 «Аб развіцці гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання». Іх пералік зацверджаны на нечарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

Адпаведны праект падчас пасяджэння агучыла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінаблвыканкама Таццяна Шаўцова. Яна канстатавала, што дакументам прадугледжаны шэраг ільгот для суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца гандлем, грамадскім харчаваннем і аказаннем бытавых паслуг. У тым ліку па аплаце падаткаў, рэалізацыі алкагольных напояў, развіцці інфраструктуры сеткавых гандлёвых кампаній, а таксама адчужэнні аб'ектаў нерухомасці без аўкцыёнаў і наяўнасці дакументаў дзяржаўнай рэгістрацыі. Дзеянні некаторых ільгот распаўсюджваюцца толькі на населеныя пункты і тэрыторыі па-за іх межамі, пералік якіх вызначаецца абласным Саветам дэпутатаў.

Новаўвядзенне было спачатку апрабавана на базе Барысаўскага і Уздзенскага раёнаў. Гэтыя раёны ўзялі для пілотнага праекта невыпадкова. Адзін з іх — буйны прамысловы цэнтр, другі — невялікі па памерах. Распрацоўшчыкі мелі на мэце зразумець, што страцяць бюджэты, калі ў далейшым гэтыя льготы распаўсюдзіць на ўсе населеныя пункты, бо на сённяшні дзень у Мінскай вобласці налічваецца да 90 працэнтаў паселішчаў, дзе пражываюць да 500 жыхароў.

Эксперымент паказаў, што ў Барысаўскім раёне гандаль, грамадскае харчаванне і бытавое абслугоўванне не адыгрываюць значнай ролі ў фарміраванні кансалідаванага бюджэту: па падліках прыкладныя страты склалі 0,7 працэнта. А вось бюджэт Уздзенскага раёна «пахудзеў» на 4,1 працэнта.

З улікам таго што дзеянне ўказа па льготах на падаткі будзе дзейнічаць на працягу пяці гадоў, прапанавана на першапачатковым этапе распаўсюдзіць прэферэнцыі на два раёны: Барысаўскі і Пухавіцкі. А па выніках работы за першае паўгоддзе 2018-га прааналізаваць, як яны спрацавалі.

— Калі мы ўбачым станоўчы эфект — развіццё прыватных аб'ектаў гандлю, зрухі да лепшага ў сістэме спажывецкай кааперацыі, стварэнне новых рабочых месцаў, — то, магчыма, варта будзе ўнесці змяненні ў гэты пералік, — лічыць Таццяна Шаўцова. — І пры неабходнасці мы будзем гэта рабіць. Пакуль жа мы спыніліся на прамысловым Барысаўскім раёне, дзе кіраўнік дзяржавы даў даручэнне навесці парадак і існуюць праблемы ў спажыўкааперацыі.

У спіс уключана 259 населеных пунктаў раёна, якія падпадаюць пад дзеянне льгот. Гэта тыя, дзе адсутнічаюць прадпрыемствы гандлю або ёсць адзін магазін спажывецкай кааперацыі, які, магчыма, не заўсёды адчынены. (Вядома, што на яго работу ўплывае, як правіла, сезоннасць, адсутнасць кадраў.) Акрамя таго, у пералік увайшлі дванаццаць тэрыторый сельсаветаў, дзе па-за межамі населеных пунктаў ёсць аб'екты прыдарожнага сэрвісу, турыстычныя аб'екты, якія маюць магазіны, кафэ, сталовыя, бытоўку.

У Пухавіцкім раёне вызначана 165 населеных пунктаў і 8 тэрыторый, а таксама тры пасёлкі, што адносяцца да малых гарадскіх паселішчаў з насельніцтвам ад 2 да 10 тыс. чалавек. Гэта Рудзенск, Свіслач і Праўдзінск. На стадыі распрацоўкі праекта было шмат дэбатаў. Перш за ўсё яны датычыліся наступнага пытання: што набудуць і што страцяць раёны ад гэтых навацый? Але палічыць страты пакуль немагчыма. Можа, мясцовыя бюджэты выйграюць за кошт падаходнага падатку, які будуць плаціць работнікі прадпрыемстваў гандлёвага і бытавога абслугоўвання. Але гэта ў тым выпадку, калі ў рэгіёны пойдуць прадпрымальнікі, бізнесмены, якія будуць адкрываць новыя пункты гандлю, грамадскага харчавання, бытавых паслуг, а значыць, з'явяцца і новыя рабочыя месцы.

У цэлым жа дакумент накіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для індывідуальных прадпрымальнікаў, юрыдычных асоб і ўдасканаленне абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці, паляпшэнне якасці жыцця. Пухавіцкі раён, дарэчы, размешчаны непадалёку ад Мінска, і, магчыма, ім зацікавіцца сталічны прыватны бізнес.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

У тэму

Без дадатковых затрат

Частка зямель Смалявіцкага раёна адыдзе Мінску. Праект зацверджаны на пазачарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

Такое рашэнне прынята па аб'ектыўных прычынах. Справа ў тым, што ў Нацыянальным аэрапорце будуецца другая ўзлётна-пасадачная паласа з дапаможнымі аб'ектамі для цяжкіх самалётаў.

У гарадскую мяжу будуць уключаны зямельныя ўчасткі агульнай плошчай крыху больш за 158 гектараў, якія належалі мясцоваму лясгасу, сельгаспрадпрыемству «Штотц Агра-Сэрвіс». Рашэнне гэтага пытання не пацягне за сабой дадатковых фінансавых затрат.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

ЯК ЗВЯРТАЦЦА, КАБ АДКАЗАЛІ?

У Палаце прадстаўнікоў прайшоў круглы стол на тэму зваротаў грамадзян

ЯГО ўдзельнікі спрабавалі высветліць, як, з аднаго боку, палепшыць якасць адказаў, а з другога — процістаяць тым, хто злоўжывае магчымасцю паскардзіцца. Паколькі большасць зваротаў, згодна са статыстыкай, — менавіта скаргі. Мікалай САВАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення канстытуцыйнага і міжнароднага права — начальнік аддзела канстытуцыйнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь, акцэнтаваў увагу на асноўных праблемных момантах.

Дэталізаваны і падрабязны

У нашай краіне існуе некалькі тэндэнцый, па якіх развіваецца заканадаўства аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб. Па-першае, гэта пашырэнне колькасці арганізацый, на якія яно распаўсюджваецца. Частка краін СНД абмежавала сферу прымянення заканадаўства аб зваротах. У Беларусі звяртацца можна ва ўсе арганізацыі незалежна ад формы ўласнасці. З аднаго боку, гэта ставіць усіх у роўныя ўмовы, з іншага — недзяржаўныя арганізацыі даволі часта са зваротамі не працуюць, хоць закон на іх распаўсюджваецца.

Па-другое, існуе тэндэнцыя да пашырэння кола суб'ектаў, якія маюць права на зварот. Дзесяць гадоў таму быў прыняты даволі радыкальны крок: заканадаўства аб зваротах пачало распаўсюджвацца на суб'екты гаспадарання. Для параўнання: у Расіі такое рашэнне было прынята нашмат пазней і на аснове пастановы Канстытуцыйнага Суда. Для саміх суб'ектаў гэта стала плюсам, але ўскладніла правапрымяняльную практыку: неабходна адмяжоўваць звароты суб'ектаў гаспадарання і дзелавую перапіску. А празрыстых стандартаў дагэтуль няма.

Але існуе і супрацьлеглы кірунак: сфера прымянення заканадаўства аб зваротах паступова звужаецца. Маецца на ўвазе, што зараз гэты закон рэгулюе не ўсе звароты, а пэўныя катэгорыі. Напрыклад, у свой час былі выключаны звароты работнікаў да кіраўнікоў. Гэта зноў жа ўскладняе практыку размяжоўвання.

Цяпер грамадзяне могуць звяртацца да ўлад не толькі ў пісьмовай ці вуснай форме, як гэта было раней, але і праз кнігу заўваг і прапаноў, электронным лістом ці праз прамую лінію. Гэта пашырае даступнасць такой практыкі, але патрабуе больш часу на апрацоўку зваротаў. Дарэчы, беларускі закон аб зваротах з'яўляецца самым дэталізаваным і падрабязным на постсавецкай прасторы.

Як гэтым карыстацца?

На практыцы прымяненне закона сутыкаецца з наступнымі праблемамі. Вялікая колькасць скаргаў паступае ў тыя арганізацыі, якія не ўпаўнаважаны іх разглядаць. У такой сітуацыі звароты перанакіроўваюцца для разгляду ў арганізацыі... на дзеянні якіх скардзяцца. Кола замыкаецца.

Гэта праблема традыцыйна падымаецца грамадзянамі. Яшчэ адна — адказ, які яны атрымліваюць. Кожны трэці апрошаны сцвярджае, што ў якасці адказу ён атрымаў ці адпіску, ці цытату з нарматыўна-прававога акта, які ён ужо ведае альбо не можа зразумець. І ў першым, і ў другім выпадку пытанне не вырашаецца пры першасным звароце. Менавіта на нізавым узроўні ўзнікае найбольшая колькасць пытанняў. Далей чалавек звяртаецца ў вышэйстаячыя органы. Перад імі, па сутнасці, дзве задачы: першая — вырашыць праблему, другая — ацаніць дзеянні службовай асобы, да якой ужо звярталіся. Выканаць апошнюю задачу не заўсёды атрымліваецца, а гэта не спрыяе таму, каб пытанні вырашаліся пры першым звароце.

Ананімныя звароты таксама патрабуюць увагі. З аднаго боку, закон гаворыць, што яны не разглядаюцца. Але могуць быць разгледжаны, калі ў іх змяшчаецца інфармацыя пра злачынства. Гэты крытэрый недастаткова празрысты, таму ў выніку на практыцы большая частка з іх усё ж такі прымаецца ў працу. Тут зноў жа дваякая сітуацыя. Калі ананімка датычыцца нейкага чалавека — гэта падрывае давер і, як лічыць Мікалай Савановіч, мае негатыўны эфект. Калі ж яна датычыцца нявыкананай працы ці функцыі (напрыклад, смецце не прыбрана), то якая розніца, хто пра гэта паведаміў? Па такім прынцыпе фарміруецца работа сістэмы 115.бел, куды можна паведаміць інфармацыю пакуль толькі пра сферу ЖКГ. Да таго ж карупцыйныя парушэнні раскрываюцца менавіта дзякуючы ананімным зваротам.

Калі вы не задаволены адказам, вядома, вы можаце паскардзіцца. Механізм абскарджвання павінен працаваць. Наш закон дае для гэтага два шляхі: адміністрацыйны і судовы. У сярэднім у год у адміністрацыйныя ўстановы накіроўваецца да 400 000 зваротаў. У суд падаецца да 1000. Гэта азначае, што грамадзяне лічаць: лепш звяртацца з адным і тым жа пытаннем у розныя ўстановы, але не ў суд. З-за гэтага нагрузка на адміністрацыйны апарат павялічваецца. І зноў кола замыкаецца: калі зваротаў прыходзіць больш, чым магчыма разгледзець, установа працуе на механічнае выкананне заканадаўства, каб даць адказ у патрэбны тэрмін. Вырашэння пытання па сутнасці не адбываецца, бо няма часу на прапрацоўку.

Над чым працуюць

Зараз ідзе работа яшчэ ў адным кірунку — пошук агульнага стандарту па трактоўцы нормаў. Для гэтага праводзяцца семінары для кантралюючых органаў і працуе міжведамасная рабочая група. Яна штоквартальна выязджае ў рэгіёны, дзе вывучае работу з насельніцтвам, у тым ліку са зваротамі.

Злоўжыванне правам на зварот — таксама галаўны боль для ўстаноў. У міжнароднай практыцы існуюць прыклады ўвядзення «чорных спісаў» ці прапановы браць плату за зварот. Для нас пакуль абодва шляхі непрымальныя, бо якасць адказаў вымушае жадаць лепшага. Тым не менш было пашырана кола падстаў для спагнання расходаў з нядобрасумленных заяўнікаў. Але пакуль паспяховых судовых спраў тут не адзначаецца. Нават калі суды першай інстанцыі вырашалі справу на карысць істца, Вярхоўны Суд адмяняў такія пастановы.

У выніку многія з пытанняў, якія існуюць у галіне заканадаўства аб зваротах грамадзян, атрымліваюцца закальцаванымі. Вырашыць іх магчыма толькі агульнымі намаганнямі і сумленнай працай, каб скаргі не гулялі па ўстановах.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

Сто гадоў на службе ў людзей

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

А вось здымак 1919 года, дзе старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР Міхаіл Калінін уручае сцяг 23-м магілёўскім пяхотным курсам чырвоных камандзіраў. Дарэчы, начальнік курсаў Пётр Лашук — адзін з першых магілёўскіх дэпутатаў. Яго фота наогул друкуецца ўпершыню. Тут жа здымкі іншых дэпутатаў 20-х гадоў, якія таксама дагэтуль можна было ўбачыць толькі ў архівах.

Другі раздзел расказвае пра часы першых пяцігодак. Горад з правінцыяльнага, рамеснага вырас да буйнога прамысловага цэнтра. І тут таксама шмат чаго зроблена дэпутатамі. Яны, як заўсёды, на перадавой — заклікаюць, арганізуюць, паказваюць прыклад.

Вялікая Айчынная вайна і абаронцы Магілёва. На адным з фота гэтага раздзела — Вера Барабашкіна, дэпутат гарсавета, якую заслалі ў тыл ворага, каб здзейсніць дыверсійную аперацыю. За гэта яна атрымала ордэн Чырвонага Сцяга. Дагэтуль пра жанчыну-героя не было вядома амаль нічога ў гісторыі Магілёва.

Наступныя раздзелы — прамысловасць, будаўніцтва. І дзейнасць дэпутатаў пасляваенных скліканняў. Пачынаючы з 1954 года і па 1991 ідзе актыўнае будаўніцтва сацыялізму, а потым Савецкі Саюз дае трэшчыну, краіна бярэ курс на незалежнасць. І дэпутаты ўжо незалежнай Беларусі зноў каардынуюць працэс.

НЕЛЬГА АДМАХНУЦЦА



— Вы — першыя з дэпутатаў, хто вырашыў пакласці гісторыю дзейнасці народных абраннікаў на паперу. Можаце цяпер вызначыцца, каму было прасцей працаваць — першым дэпутатам або вам? — па-

Магілёўскі гарсавет сёння.

цікавілася «МС» у **старшыні Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргея ІВАНОВА.**

— Нездарма кажуць: каб лягчэй было рабіць сучаснае, трэба добра ведаць мінулае. У кожнага склікання дэпутатаў былі свае асаблівасці і цяжкасці. Вельмі складаным быў перыяд пераходу пасля развалу Савецкага Саюза да незалежнай Беларусі. Тады шмат чаго было незразумелым: пра далейшы шлях развіцця Беларусі кожны меў сваё меркаванне. Быў час, калі дэпутаты па два-тры дні не маглі зацвердзіць парадак дня... Калі ўстанавілася выразная сістэма размеркавання службовых абавязкаў, стала больш празрыстай работа выканаўчай і прадстаўнічай галін. Але ці стала прасцей, цяжка сказаць.

— Якая, на ваш погляд, галоўная місія дэпутата?

— Служэнне народу. У імя народа, разам з народам і толькі для народа. Што б хто ні казаў, дэпутат — слуга народа, сувязнае звяно паміж уладай і народам. Праблемы, якія ёсць у людзей, дэпутат не дзеліць на важныя і другасныя. Калі чалавек звярнуўся з праблемай, значыць, яе трэба вырашаць. Нельга ад гэтага адмахнуцца.

— Ці праўда, што без дэпутатаў не вырашаецца ніводная важная справа ў горадзе?

— У адпаведнасці з законамі «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета Рэспублікі Беларусь», рэгламентам установлена выключная кампетэнцыя гарадскога Савета. Яна ахоплівае асноўныя пытанні жыццезабеспячэння, жыццядзейнасці горада — гэта зацвярджэнне і кантроль за рэалізацыяй праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, фарміраванне і зацвярджэнне бюджэту, гэта распараджэнне гарадской камунальнай маёмасцю, пытанні забеспячэння і функцыянавання сацыяльнай інфраструктуры — адукацыі, аховы здароўя, працаўладкавання, абслугоўвання асоб, якія знаходзяцца ў цяжкім жыццёвым становішчы, зацвярджэнне аб'ектаў будаўніцтва. Ні адно пытанне, якое датычыцца горада, не вырашаецца без удзелу дэпутатаў. Усе яны разглядаюцца на сесіі.

— Вы ўпісалі ў кнігу і сваю старонку — дзейнасць дэпутатаў 27-га склікання. Што пра вас з гэтай кнігі даведаюцца нашы нашчадкі?

— Можна занесці ў актыў тое, што пры нас, гарадскім Савеце дэпутатаў, створаны Маладзёжны парламент. Гэта калі ўсе 73 гарадскія ўстановы адукацыі сярэдняга, сярэдняга спецыяльнага, вышэйшага звяна прадстаўлены ў ім. Юнакі і дзяўчаты ў нас творчыя, крэатыўныя, і Маладзёжны парламент — гэта тая пляцоўка, дзе яны могуць рэалізаваць свае магчымасці, падрыхтавацца да ўступлення ў будучае дарослае жыццё. Моладзі ўласцівы юнацкі максімалізм. Дарослы падумае, але не заўсёды і скажа, а малады заўсёды выкажа свой пункт гледжання. Часам ёсць і слушныя прапановы, асабліва гэта датычыцца маладзёжных ініцыятыў, звязаных з патрыятычным выхаваннем, здаровым ладам жыцця, культурай паводзін, правядзеннем мерапрыемстваў у знакавыя для горада дні.

РОБІМ ГІСТОРЫЮ

Вячаслаў ПАНЦЮХОЎ, старшыня пастаяннай камісіі Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў па гарадской гаспадарцы і сферы паслуг:

— Стагадовая гісторыя, безумоўна, аказвае ўплыў на нашу работу. Мы бяром на ўзбраенне найлепшыя прыклады, якія былі пададзены дэпутатамі першых скліканняў. У кожнага часу ёсць свае выклікі, але нас аб'ядноўвае тое, што большасць дэпутатаў на працягу ўсяго перыяду стагадовай гісторыі былі зацікаўлены ў тым, каб Магілёў стаў больш прыгожым і камфортным для жыцця. І рабілі ўсё, што ад іх залежыць, у тых умовах, у якіх жылі і працавалі. Безумоўна, і мы ўнеслі свой уклад у развіццё горада. Гэта, напрыклад, адноўлены мост цераз Дняпро, рэканструкцыя якога закончылася летась. Праект дапрацоўваўся па меры выканання работ, і ў яго абмеркаванні актыўны ўдзел прымалі дэпутаты. Цяпер шчыльна працуем над стварэннем парку. На жаль, пакуль у Магілёве няма такога парку, як у Гомелі ці Мінску, але гэта толькі справа часу. Парк ствараецца ў Падмасколлі, і мы прымаем актыўны ўдзел у гэтым.

Радуе, што жыхары апошнім часам таксама ўцягваюцца ў работу па навядзенні парадку, спрабуюць сваімі рукамі, за кошт асабістых сродкаў зрабіць свае дамы і пад'езды лепшымі, упрыгожыць дваравыя тэрыторыі. Калі падводзілі агляд-конкурс, прыйшлі да высновы, што з кожным годам такіх дамоў, пад'ездаў, двароў становіцца ўсё больш.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

СПАКОЙНА І ЎЗВАЖАНА

АДЗІНАЯ ФОРМА

Прэзідэнт нашай краіны ў сваю чаргу вельмі ўважліва ставіцца да работы з грамадзянамі. Яго патрабаванне да Адміністрацыі Прэзідэнта і ўвогуле да дзяржструктур — выбудаваць работу са зваротамі так, каб у людзей не складвалася ўражанне, што да кіраўніка краіны немагчыма данесці тую ці іншую праблему.

На думку Прэзідэнта, тут трэба выпрацаваць нармальную форму:

— Усё цягнецца з савецкіх часоў. Нехта напісаў у Адміністрацыю Прэзідэнта або на імя Прэзідэнта, нехта скардзіцца на мясцовыя органы ўлады, а мы туды накіроўваем для разгляду гэтыя скаргі і заявы. Непатрэбны паток інфармацыі.

Раней Аляксандр Лукашэнка выказваўся наконт канфліктаў улад і насельніцтва ў тым, што датычыцца беспадстаўнага ўшчыльнення жыллёвай забудовы і высякання дрэў у населеных пунктах. На думку кіраўніка краіны, улады заўсёды павінны ведаць, як адрэагуе насельніцтва на тое ці іншае іх рашэнне.

— А то хутка адзеравянеем, як у асобных нашых суседзяў: улада сама па сабе, а людзі — самі па сабе, — аргументаваў Прэзідэнт.

САЦЫЯЛЬНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ

У Канстытуцыі Беларусь заяўлена як сацыяльная дзяржава, гэтага ж прытрымліваецца і дзяржаўная палітыка ў сваіх кірунках. Напрыклад, на мінулым тыдні ў Палацы Незалежнасці абмяркоўваліся вынікі 10 месяцаў бягучага года і планы — эканамічныя — на наступны год. Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, сацыяльная скіраванасць бюджэту захаваецца. Сапраўды, для людзей важныя не столькі паказчыкі ВУП (прынамсі, рэдка хто з неспецыялістаў пра гэта задумваецца), колькі тое, як палітыка, якую рэалізуюць улады, садзейнічае вырашэнню надзённых праблем. Адпаведна, для ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады проста неабходны канал зваротнай сувязі з людзьмі. Менавіта гэта мэта, відаць, павінна выяўляць і быць ключавой для кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, памочнікаў Прэзідэнта, кіраўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, губернатараў, старшынь райвыканкамаў падчас тых прыёмаў грамадзян, прамых тэлефонных ліній, якія яны рэгулярна праводзяць.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».

Фота БЕЛТА.

Адказы на звароты грамадзян павінны быць вычарпальнымі, лічыць кіраўнік Апарату Савета Міністраў Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН.

З іншага боку, важна, каб з дробнымі пытаннямі, якія не патрабуюць вялікіх фінансавых і матэрыяльных выдаткаў, людзі не імкнуліся трапіць да высокіх чыноўнікаў. Такога кшталту праблемы, як добраўпарадкаванне вуліцы або аварыйны стан дрэва і іншае, — задача перш за ўсё мясцовых улад, тых жа сельскіх Саветаў дэпутатаў, выканкамаў.

ЧАЛАВЕЧЫ ПАДЫХОД

Яшчэ адна важная рэч: з пытаннямі, з якімі чалавек можа разабрацца самастойна, не трэба ісці ў той жа сельвыканкам, тым больш на прыём да міністра. Напрыклад, добраўпарадкаванне ўласнага жылля — задача перш за ўсё ўласнікаў. Прынамсі, жыллё ў нас у большасці сваёй прыватнае. Але ў тым выпадку, калі размова ідзе аб капітальным рамонце або аварыйным стане дома — гэта значыць, праблемах, якія чалавеку складана вырашыць самастойна, — неабходна рэакцыя ўлады. Прычым неадкладная.

Сапраўды, вельмі шмат — калі не большасць — зваротаў грамадзян традыцыйна датычацца сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Падчас рэспубліканскага семінара «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны», які праходзіў у мінулым месяцы на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт заявіў:

— Не трэба забываць, што амаль трэць апытаных грамадзян дае рабоце сістэмы ЖКГ негатыўную ацэнку. Па значнасці для насельніцтва гэтыя пытанні займаюць другое месца пасля занятасці. І пакуль у адрас сістэмы чуецца крытыка, супакойвацца рана.

Аляксандр Лукашэнка ў гэтай сувязі звярнуў увагу, што трэба выразна размежаваць для насельніцтва, што павінна ў сэнсе ЖКГ рабіць дзяржава, а што — самі людзі. Гэта звязана з тым, што ёсць скаргі, — маўляў, недзе не адрамантавалі, недзе не пафарбавалі. У той жа час многае службы ЖКГ рабіць і не павінны. Пры гэтым, дадаў Прэзідэнт, трэба мець на ўвазе, што не кожны чалавек, нават калі ён прыватызаваў жыллё, можа сам справіцца ўнутры яго з работамі. Старыя, хворыя, інваліды — гэта тыя, каму дзяржава павінна дапамагчы.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

КАЛЕКТЫЎНАЕ ПІСЬМО — СХОД — КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ

У Пружанскім раёне змяншаецца паток зваротаў грамадзян

ТАК атрымалася, што Калядзіцкі сельскі Дом культуры ледзь не адзіная ў раёне ўстанова названай галіны, якая дажыла да нашых дзён без капітальнага рамонту. СДК быў узведзены яшчэ ў савецкія часы перадавым калгасам, які ўзначальваў Герой Сацыялістычнай Працы Яўген Кудзінаў. Цяпер гаспадарка называецца «Агра-Калядзічы». Дык вось, на балансе гэтага сельгаспрадпрыемства вясковая культурная ўстанова была даўжэй за ўсе іншыя. А калі ДК усё ж перадалі аддзелу культуры, грошай на рэалізацыю такіх вялікіх праектаў там не знайшлі.

Такім чынам, Дом культуры ў Калядзічах, дзе праходзіць шмат мерапрыемстваў, куды на рэпетыцыі збіраюцца ўдзельнікі самадзейнасці, дзе працуюць дзіцячыя гурткі харэаграфіі і іншых відаў мастацтва, сустрэў 2017 год у вельмі непрывабным стане. Дах працякаў, у залах і пакоях для заняткаў сцены былі спрэс абшарпаныя, а за санвузлы соромна было перад людзьмі... І нельга сказаць, што кіраўніцтва раёна аб праблеме не ведала, бывалі тут раней і старшыня райвыканкама, і яго намеснікі... Але калі ў самым пачатку года прыйшло пісьмо, пад якім падпісалася ледзь не большасць жыхароў аграгарадка Калядзічы, у вёсцы прызначылі сход.

— На сход прыйшло нашмат больш людзей, чым паставіла подпісы пад зваротам, — расказала **старыня Харaўскога сельскага Савета дэпутатаў Алёна ПСТЫГА.** — Вяскоўцы зноў выказалі сваю просьбу кіраўнікам раёна, на гэты раз не пісьмова, а вусна — у той самай глядзельнай зале, якая ўсім сваім выглядам маліла пра абнаўленне. Тады ж было прынятае рашэнне шукаць сродкі і пачынаць рамонт. Частку грошай выдзелілі з раённага бюджэту, прафінансаваць замену даху ўзялося ААТ «Агра-Калядзічы».

Зараз зроблена вельмі многа, сцвярджае кіраўнік мясцовай улады. Яшчэ ў маі на Доме культуры з'явіўся новы дах, адрамантаваны залы для заняткаў харэаграфіяй, а таксама бібліятэка, увесь другі паверх абноўлены. Сучасны выгляд набылі санвузлы. І да 1 снежня будаўнікі абяцаюць завяршыць гэты этап рамонту. На наступны год застаюцца глядзельная зала, фасад, дзверы, некаторыя вонкавыя канструкцыі. Галоўнае, што на Дзень работніка сельскай гаспадаркі тут праводзілі канцэрт і людзі засталіся вельмі задаволеныя. «Усе лічаць, што штуршком да пачатку рамонту стала менавіта калектыўнае пісьмо», — заключыла Алёна Рыгораўна.

Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Пружанскага райвыканкама Алена ХАТУЛЕВА паведаміла, што за 10 месяцаў гэтага года падчас прамых ліній, выязных прыёмаў, а таксама па пошце ў райвыканкам паступіла 430 зваротаў. 92 з іх былі задаволеныя, 33 знаходзяцца ў стадыі разгляду. Па астатніх прынятыя адпаведныя рашэнні, напрыклад, у 250 выпадках заяўнікам дадзена тлумачэнне.

Алена Хатулева адзначае, што пастаянны характар маюць просьбы, якія датычацца добраўпарадкавання тэрыторый населеных пунктаў, нярэдка гаворка ідзе пра знос старых або аварыйных дрэў. Напрыклад, на прамую лінію да намесніка старшыні райвыканкама паступіла просьба знесці старое дрэва ў вёсцы Сілічы. Пры выездзе на месца спецыялісты ўпэўніліся, што дрэва пагражала пабудове, таму было прынятае рашэнне яго спілаваць. Работы выканала брыгада раённых электрасетак. На тэлефонную лінію да другога намесніка старшыні райвыканкама патэлефанавалі жыхары вёскі Юндзілы. Яны прасілі правесці ямачны рамонт участка дарогі Клепачы — Варанілавічы — Юндзілы. Гэту работу аператыўна правялі дарожнікі Пружанскага ДРБУ-140.

Аналіз зместу зваротаў нярэдка паказвае наяўнасць тых ці іншых сацыяльна-эканамічных праблем. Напрыклад, жыллёвы фонд былых ваенных гарадкоў, якіх пад Пружанамі некалькі, таксама перыядычна патрабуе рамонтных работ. Вось і сёлета зарэгістраваны звароты з такіх гарадкоў.

Нярэдкія і нараканні на абслугоўванне гарадскіх і вясковых шматкватэрных дамоў, якія таксама маюць немалы ўзрост. У некаторых выпадках пасля звароту ўдавалася правесці рамонт, у іншых — тлумачылі людзям, калі іх дом можа быць уключаны ў план па рамонце ў залежнасці ад фінансавання.

Апошнім часам назіраецца спад колькасці пісьмовых і вусных зваротаў, канстатуе начальнік аддзела. На яе думку, такому становішчу ў многім спрыяе сістэма работы са зваротамі, выбудаваная ў раёне. Раз на квартал на прыёмы ў вёску выязджае кожны намеснік старшыні райвыканкама. Старшыня райвыканкама Міхаіл Крэйдзіч праводзіць выязны прыём грамадзян кожны месяц. Раней кіраўнік раёна найчасцей слухаў людзей у пасёлках Ружаны, Шарашова, іншых самых буйных населеных пунктах. А калі там стаў заўважацца спад колькасці ахвотных пагутарыць са старшынёй, адрасы выязных прыёмаў сталі мяняцца.

Работнікі аддзела вядуць пастаянны маніторынг — з якой мясцовасці назіраецца рост колькасці пісьмаў і званкоў, тую і выбіраюць для наступнага прыёму кіраўніка. І гэта дае станоўчы эфект. Дастаткова сказаць, што звароты у вышэйстаячыя інстанцыі з раёна ў гэтым годзе паступіла на 64 працэнты менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Рэгулярна ў раёне ладзяцца прыёмы службовымі асобамі абласных і рэспубліканскіх кіруючых органаў. Не так даўно праходзіў выязны прыём начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Юрыя Крывашэева, да якога звярнуліся восем жыхароў раёна — кожны са сваім пытаннем. Напрыклад, жыхар горада прасіў выдзеліць на тэрыторыі раёна ўчастак зямлі для вядзення сялянска-фермерскай гаспадаркі, другі хацеў адрамантаваць балкон у сваёй прыватызаванай кватэры. У абодвух выпадках просьбы былі задаволеныя. Варта адзначыць, што раней названыя грамадзяне не звярталіся ні ў адну раённую інстанцыю, інакш іх праблемы былі б вырашаныя на мясцовым узроўні, паведамілі ў райвыканкаме. Але ж законнае права грамадзян — звяртацца з пытаннем да любой службовай асобы, і гэтым правам людзі карыстаюцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

Пружанскі раён.

НА ПРЫЁМЕ

РАЗАБРАЦЦА ПА ФАКЦЕ

Як зварот спрыяе ініцыятыве, і чаму грамадзяне ходзяць па інстанцыях

У Гродзенскай вобласці робяць стаўку на якасць работы са зваротамі. Гэта значыць — вырашыць пытанне па максімуме і адказаць па сутнасці, каб перапіска не цягнулася гадамі, а заяўнік не шукаў «праўды» ў вышэйшых інстанцыях. Дынаміка ёсць, кажуць спецыялісты, але відаць і «слабыя» месцы ў гэтай адказнай рабоце.



Прыём грамадзян у Воранаўскім раёне вядзе памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей РАЎНЕЙКА.

Пазбавіцца ад фармалізму

Існуе практыка, калі чалавек адразу ідзе «наверх», не заходзячы, што называецца, да мясцовага кіраўніцтва. У вобласці ёсць нават выпадкі, калі ў сельвыканкаме з пачатку года зарэгістраваны... толькі адзін зварот. Можа, праблем там няма? Хутчэй за ўсё, справа ў фармальным падыходзе. Чым інакш можа растлумачыць той факт, што гэты адзіны зварот мала таго, што быў перанакіраваны ў іншае ведамства, дык мясцовая ўлада нават не пацікавілася яго канчатковым рашэннем. Хоць чалавеку павінны адказаць на тыя пытанні, якія ён ставіць. Альбо прыняць меры, альбо праінфармаваць, як будзе вырашацца дадзеная праблема.

Ці такі прыклад. Напісала бабуля пісьмо да мясцовага кіраўніцтва, расказала аб сваім нялёгкім жыцці на трох літсках паперы і ў канцы вельмі сціпла сваю праблему выказала. Як адказвае ёй прадстаўнік улады? «Паважаная Марыя Іванаўна, па сутнасці вашага пытання... згодна з існуючай пастановай... не ўяўляецца магчымым...» і гэтак далей. А калі б гэтай Марыі Іванаўне сам кіраўнік раёна патэлефанаваў ды падзякаваў за добрасумленную працу і актыўную жыццёвую пазіцыю, растлумачыў, што робіцца ў раёне станоўчага, і шчыра сказаў, чаму зараз нельга вырашыць яе праблему, то, можа, бабуля і не была б пакрыўджана такой адпіскай, і не шукала б дапамогі ў іншых кабінетах.

Добра зарэкамендавала сябе практыка прамых тэлефонных ліній, адзначылі ў абласным аддзеле па зваротах грамадзян. Колькасць званкоў паменшылася ў дзясяткі разоў. Калі на пачатку ўкаранення новаўвядзення іх рэгістравалася да 2,5 тысячы за прыём, то зараз паступае 30—40 званкоў. Гэта значыць, што кожны, хто тэлефануе, гарантавана атрымае адказ. Разам з памяншэннем колькасці званкоў у аблвыканкам расце іх колькасць у раённыя выканаўчыя органы. Многія пытанні носяць кансультацыйны характар.

Не ўсе звароты слушныя

У жыццёвым асяроддзі бытуе думка, што тыя, каму сапраўды патрэбна дапамога, не абіваюць парогі высокіх кабінетаў. Але гэта не значыць, што такія людзі застаюцца без увагі. У рабоце са зваротамі дзейнічае так званы выяўны прынцып. Мясцовыя ўлады не чакаюць, пакуль чалавек звернецца да іх па дапамогу, а самі ідуць да яго. У гэту катэгорыю трапілі і састарэлыя, і адзінокія, якіх не даглядаюць дарослыя дзеці. Сацыяльныя службы часам шукаюць гэтых «дзетак», каб накіраваць іх да бацькоў, хоць тыя і не просяць. І на вёсках зараз такіх састарэлых нямала.

Некаторыя заяўнікі імкнуцца з дапамогай улады вырашыць асабістыя пытанні, часцей за ўсё «яблыкам разладу» становяцца зямля і жыллё. Асабліва калі ёсць долевая ўласнасць. Спрэчкі па іх вядуцца гадамі. Ну як, напрыклад, памірыць маці і дачку, якія не могуць ужыцца на агульнай кухні? Згодна з рашэннем суда, кватэра паміж імі падзелена, акрамя месцаў агульнага карыстання. Але жанчыны ўпарта канфліктуюць і спрабуюць уцягнуць у гэту спрэчку яшчэ і прадстаўнікоў улады.

А то жывуць сабе суседзі, адзін да другога ў госці ходзяць, сябруюць. І раптам нібыта чорны кот прабег — пачынаюць сварыцца. А ўсё з-за таго, што адзін сусед плот паставіў і захапіў некалькі сантыметраў чужога ўчастка. І паляцелі ў выканкам скаргі... Здаецца, дробязь, але гэтыя разборкі патрабуюць не толькі часу, але і намаганняў, якія можна было б скарыстаць для іншай справы.

Так званых прафесійных скаржнікаў стала менш, удакладнілі ў аблвыканкаме. Магчыма, гэтаму садзейнічае прававая база і адпаведны артыкул, згодна з якім адрасат можа спагнаць расходы за неабгрунтаваныя звароты (звароты, па якіх заяўнік ужо атрымаў адказ). Праўда, пакуль артыкул у рэгіёне прымяняўся ў прафілактычных мэтах — да спагнання выдаткаў справа не дайшла.

Ад зваротаў да сумесных спраў

У самім абласным цэнтры назіраецца рост зваротаў. Гэта абумоўлена і пошукам працоўных месцаў, і заварваннем смецце-праводаў. Хвалюе гараджан стан жылога фонду, дарог, работа транспарту.

— На гэтыя сігналы ўлады, вядома, рэагуюць, хоць і не ўсе пажаданні выконваюцца, — тлумачыць **кіраўнік спраў Гродзенскага гарвыканкама Віталь МАМАЧКІН**, — што датычыцца рамонту, ён вядзецца згодна з графікам, праблемныя жылыя дамы па просьбах гараджан уносім у спісы.

Улады Гродна ў першую чаргу ідуць насустрач тым зваротам, якія маюць сацыяльную накіраванасць, і дапамагаюць не толькі камусьці аднаму, але і іншым. Напрыклад, па просьбе жыхара дома па вуліцы Фурсенкі тут літаральна нядаўна ўладкавалі каля пад'езда электрапад'ёмнік і пандус. Пасля звароту жыхаркі з вуліцы Таўлая замянілі лаўкі і ўстанавілі яшчэ адну паміж паліклінікай і прыпынкам транспарту. Зараз разглядаецца пытанне па замене рэгулятара ацяпляльнай сістэмы ў доме па вуліцы Брыкеля. Жыхарка паскардзілася на тое, што ноччу агрэгат вельмі шуміць. Камісія гэты факт пацвердзіла, і на пачатку будучага года яго абяцаюць замяніць.

Днямі паступіў зварот ад уласнікаў музея-аптэкі з просьбай знізіць каэфіцыент арэнднай платы. Мяркуецца, што гэта пытанне будзе разгледжана станоўча. Музей-аптэка знаходзіцца ў гістарычным будынку, тут размешчаны ўнікальныя экспанаты часоў Тызенгаўза і Жылібера, якія ў XVIII стагоддзі стварылі ў Гродне першую на тэрыторыі Беларусі Медыцынскую акадэмію.

Звароты сталі падставай для сумесных акцый. Адна з іх датычыцца зносу стыхійных дач каля былога ваеннага гарадка. Жыхары звярнуліся да ўладаў з прапановай добраўпарадкаваць тэрыторыю і падключыліся да работы. Дзякуючы агульным намаганням тут раскінуўся вялікі парк, у якім праходзяць сумесныя з жыхарамі суботнікі па пасадцы дрэў. Людзі не толькі прад'яўляюць патрабаванні да ўладаў, але і самі наводзяць парадак каля сваіх дамоў, зазначылі ў гарвыканкаме.

Апошнім часам адміністрацыя горада вядзе выязныя прыёмы ў ЖЭСах і навучальных установах. Гэта дазваляе ацаніць сітуацыю, даведацца аб матэрыяльным стане школ. Так, пасля прыёму ў СШ №5 палепшылі асвятленне і замянілі вокны. Такое ж пытанне вырашаецца па школе №32.

На прыём — з ідэяй

Сваю прапанову Ірына Аркадзеўна «прабівае» не адзін месяц. Хадзіла па розных інстанцыях і нарэшце звярнулася да кіраўніцтва аблвыканкама. Яна просіць падтрымкі ў арганізацыі вечароў адпачынку «Для тых, каму за...» Разам з мужам набылі апаратуру, афармілі ІП. Але праблема знайсці залу. Раней такія вечары праводзіліся на базе гандлёвага каледжа, куды збіралася да 300 чалавек ва ўзросце ад 40 гадоў, расказала Ірына. Яна і сама пазнаёмілася тут са сваім мужам. Вечары былі папулярным месцам адпачынку, але пасля няшчаснага выпадку ва ўстановах адукацыі іх забаранілі. Сужэнцы не губляюць надзеі ўзнавіць такія сустрэчы, бо яны запатрабаваны ў людзей сярэдняга і старэйшага ўзросту. Тут можна арганізаваць і клубы па інтарэсах, ёсць нямала музычных калектываў з ліку пенсіянераў.

— Лічу, што гэту ідэю неабходна падтрымаць, — упэўнены **намеснік старшыні аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — У любым узросце павінны быць магчымасці для культурнага адпачынку, знаёмстваў. Відавочна, што такіх месцаў у нас недастаткова. Мы гэту тэму будзем працягваць, вядзецца апытанне грамадзян пажылога ўзросту аб іх пажаданнях у плане вольнага часу.

Трэба сказаць, што ў Гродне вечары «Для тых, каму за...» праводзяцца ў двух забаўляльных комплексах. У цёплы сезон людзі збіраюцца ў лесапарку Пышкі, дзе за кошт гарадскога бюджэту зроблены пляцоўка, навес, лаўкі. Такія вечары папулярныя ў пенсіянераў, сюды прыходзяць нават тыя, каму за 80. Што датычыцца ідэі гродзенцаў, Віктар Лісковіч даручыў пасадзейнічаць дадзенаму праекту, высветліць, на якіх умовах можна вярнуць вечары ў былое месца альбо падабраць недарагую арэнду ў іншым памяшканні.

— Зараз на прыёмы ў аблвыканкам прыходзіць не так шмат людзей, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Улады кожны тыдзень на сувязі з грамадзянамі, таму асноўныя пытанні здымаюцца падчас пастаяннай работы са зваротамі.

Вуліцы — пад асобны кантроль

Мясцовыя ўлады заклапочаны станам дарог у населеных пунктах. У Воранаўскім раёне жыхары часцей за ўсё звяртаюцца са скаргамі менавіта па гэтай праблеме. Вось і на чарговым прыёме прадстаўніка Прэзідэнта паўстала пытанне добраўпарадкавання вуліцы ў аграгарадку Беняконі. Было дадзена даручэнне да восені гэту праблему вырашыць. Як паведаміла **намеснік старшыні Воранаўскага райвыканкама ГРАЖЫНА Крахмальчык,** былы грунтовы праезд ужо адрамантавалі, зрабілі гравійнае пакрыццё. Праўда, для гэтага прыйшлося задзейнічаць многія арганізацыі, бо бюджэтных сродкаў не хапіла.

— Гэта новая забудова, тут выдзяляліся ўчасткі, а камунікацыі не паспелі за іх асваеннем, таму і кавалак дарогі ў 180 метраў на вуліцы Школьнай застаўся без рамонту, — растлумачыла прадстаўніца адміністрацыі раёна.

Як аказалася, гэта праблема не толькі аднаго аграгарадка, але і многіх населеных пунктаў. Жыхары звяртаюцца і па іх асвятленні, і па добраўпарадкаванні. Але мясцовы бюджэт вельмі бедны.

— Такіх вясковых вуліц, якія патрабуюць рамонту, вельмі многа паўсюдна, — зазначыла Гражына Міхайлаўна, — а паколькі на ўзроўні кіраўніцтва краіны зноў засяродзілі ўвагу на навядзенні парадку на зямлі, было б добра гэту работу пачаць з вясковых дарог. Можа, і ўказам замацаваць.

У райвыканкаме нагадалі, якая значная работа разгорнута ў краіне па замене цеплатрасы, рэканструкцыі дарожных магістраляў. Прыспела пара заняцца і вуліцамі населеных пунктаў. Патрэбна заканадаўчая база, бо адным мясцовым бюджэтам такую справу не адужаць, кажуць чыноўнікі. Дарогу ж трэба пастаянна трымаць «у тонусе», грэйдзіраваць, каб па вёсцы можна было не толькі ў гумовых ботах хадзіць. Аб гэтым гаварылі людзі і падчас выязнога прыёму.

Дарэчы, па статыстыцы, выязныя прыёмы запатрабаваныя. Напрыклад, да кіраўніка вобласці больш народу прыходзіць на прыёмах у раёнах, чым у абласных цэнтрах. Аналіз зваротаў якраз і дае магчымасць даведацца аб самых надзённых патрэбах жыхароў, асабліва вяскоўцаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

У кожнага — свая праблема...

Дакладна: За 9 месяцаў гэтага года ў аблвыканкам на прамую лінію па суботах паступіла 4659 званкоў. Гэта на 731 тэлефонны зварот менш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Часцей за ўсё пытанні датычацца работы камунальнай гаспадаркі (2137), працаўладкавання і заработнай платы (367), а таксама будаўніцтва і жылля (347).

Агульная колькасць зваротаў за 9 месяцаў складае 12 457. Гэта лічба ў параўнанні з мінулагоднім перыядам паменшылася амаль на адну тысячу. Палова зваротаў паступіла ў гарадскія і раённыя выканаўчыя камітэты, амаль трэцяя частка — у сельвыканкамы.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

«ДАХ ПАЦЁК, ТАВАРЫ ВЫВЕЗЛІ»

Жыхары вёскі хвалююцца, што на зіму застануцца без крамы

КАЛІ жыхары буйных гарадоў збіраюцца па пакупкі, яны звычайна не ведаюць, куды пайсці: столькі крам побач з домам! У вёсках сітуацыя зусім іншая. Гандлёвых аб'ектаў на сяле адзінкі, і калі які-небудзь з іх закрываюць, для мясцовых гэта — сапраўдная трагедыя. Нядаўна ў рэдакцыю звярнуліся жыхары вёскі Лескавічы Шумілінскага раёна. Пад лістом з просьбай выратаваць краму падпісаліся 50 чалавек.

РАМОНТ ДОЎГА АДКЛАДАЛІ

Сяльчанін Мікалай Рыгоравіч Макаранка расказвае: магазін спажыўтаварыства закрылі ў пачатку кастрычніка. У тыпавым цагляным будынку пацёк дах. Але замест таго, каб памяшканне адрамантаваць, тавары вывезлі, а сам гандлёвы аб'ект закрылі.

— У нашай вёсцы пражываюць 175 чалавек. Акрамя карэнных жыхароў, паслугамі крамы карысталіся навучэнцы гімназіі, а ў летні час — дачнікі і тыя, хто адпачываў на мясцовым возеры, — кажа Мікалай Рыгоравіч.

Магазін у выніку перадалі ў карыстанне Бешанковіцкага райспажыўтаварыства. Ходзяць чуткі, што, магчыма, яго ў арэнду возьме прыватная асоба. Але, па словах Мікалая Макаранкі, вяскоўцам розніцы няма: абы аб'ект працаваў. Вось толькі рамонт доўга адкладалі і распачалі літаральна тыдзень таму.

— Хутка зіма, — хвалюецца суразмоўнік. — Як быць жыхарам вёскі? Прыйдзе канец лістапада, краму не адрамантуюць, а мы пачуем у адказ, што цяпер гэта і немагчыма з-за ўмоў надвор'я.

Найбліжэйшы магазін — у Шуміліне, за сем кіламетраў. Але ж у Лескавічах шмат пенсіянераў, хіба яны находзяцца ў райцэнтр? Пакуль што прадукты прывозіць аўталаўка. «Але яна, ведаеце, як ходзіць? Напішуць, што будзе ў абед, — прыедзе ў дзесяць гадзін раніцы. Людзі ж не могуць увесь дзень сядзець на лаўцы і чакаць», — абураецца наш чытач.

Мікалай Макаранка ўспамінае: 7—8 гадоў таму ў вёсцы хацелі закрываць пошту. Жыхары тады ў «Звязду» звярнуліся, і пытанне вырашылася на іх карысць — аддзяленне пакінулі. Яно і сёння працуе, заўважае Мікалай Рыгоравіч, людзі задаволены. А калі і пошту, і краму закрыць, што ж ад вёскі застанецца?

МАГАЗІН АДКРЫЮЦЬ ПЕРШАГА СНЕЖНЯ

У Шумілінскім райвыканкаме тлумачаць, што краму закрылі з-за аварыйнага стану. Чаму яе своечасова не адрамантавалі? «На гэта пытанне я спрабавала атрымаць адказ у райспажыўтаварыстве. Яны спасылаюцца на цяжкае фінансавае становішча», — каментуе сітуацыю **намеснік старшыні выканкама па эканоміцы Таццяна ВАРАБ'ЁВА.**

Шумілінскае спажыўтаварыства цяпер знаходзіцца ў стадыі банкруцтва. Усе гандлёвыя аб'екты, якія ўваходзілі ў яго склад, было вырашана перадаць у арэнду Бешанковіцкай кааперацыі. Прадаўцы таксама пераводзяцца ў гэту арганізацыю. Што да крамы ў Лескавічах, то новы арандатар спачатку не надта хацеў яе браць — з-за дрэннага стану. Але пытанне ўдалося вырашыць. Адкрыць ужо адрамантаваны магазін павінны 1 снежня.

У тым, што аб'ект у будучыні, магчыма, перададуць прыватнай асобе, Таццяна Вараб'ёва не бачыць нічога страшнага.

— Асартыментны пералік будзе захоўвацца і прыватнікам, і кааперацыяй. Патрабаванні адны і тыя ж, — запэўнівае яна. — Для нас галоўнае — каб у насельніцтва не было нараканняў.

Іншая рэч, што сярод мясцовых прадпрымальнікаў ахвотных трымаць краму на вёсцы няма. Па словах **старшыні Светласельскага сельвыканкама Віктара ШЧАРБАКОВА,** падобныя прапановы ўспрымаюцца без энтузіязму — бізнесменам цікавей адкрывацца ў больш людных месцах. Так, на тэрыторыі сельсавета ёсць толькі адна прыватная кавярня — у вёсцы Язвіна.

Чаму Шумілінская кааперацыя збанкрутавала?

— Прычына — дрэнная гаспадарчая дзейнасць. Канкурэнцыя там не настолькі значная, — упэўнены **старшыня праўлення Віцебскага аблспажыўсаюза Аляксандр ПУЦЯТА.**

Ён дадае, што па сацыяльных стандартах, калі ў населеным пункце пражывае менш за 200 чалавек, краму могуць закрыць. Але кааперацыя звычайна звяртаецца да гэтых мер толькі тады, калі ў вёсцы застаецца менш за 50 чалавек.

— Ёсць вёскі, дзе і па 20—30 жыхароў, але мы трымаем магазін. Бо ёсць у наяўнасці прадаўцы: пенсіянеркі два-тры разы на тыдзень выходзяць на змену, і ўсіх гэта задавальняе, — расказвае Аляксандр Пуцята. — А ўвогуле, складана знайсці работніка, які будзе прыязджаць у вясковую краму, калі разумее, што таваразварот невялікі, а значыць, і заробак невысокі. Таму працоўныя рэсурсы ў сельскай мясцовасці — адна з асноўных нашых праблем.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

ЦІ МОЖА РАЙПО БЫЦЬ ПРЫБЫТКОВЫМ?

У найбліжэйшы час члены Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі збіраюцца абмяркоўваць пытанні функцыянавання спажывецкай кааперацыі. Удзельнікаў выязнога пасяджэння азнаёмяць з дзейнасцю Пастаўскага райспажыўтаварыства. Напярэдадні наш карэспандэнт пацікавіўся, што ўяўляе сабой сістэма спажывецкай кааперацыі Віцебскай вобласці ў цэлым і канкрэтна ўзятага раёна — у прыватнасці.

Накормяць і нарыхтуюць

Паводле слоў **старшыні праўлення Віцебскага аблспажыўсаюза Аляксандра ПУЦЯТЫ,** у сістэму спажывецкай кааперацыі ўваходзяць 18 раённых спажывецкіх таварыстваў і 11 унітарных прадпрыемстваў аблспажыўсаюза.

— У асноўным займаемся гандлем: усяго ў нас каля 1,3 тысячы крам, 63% іх — у сельскай мясцовасці. Больш за 4 тысячы населеных пунктаў абслугоўваюць 160 аўтакрам.

Гандаль «з колаў», як і аб'екты ў невялікіх населеных пунктах, з-за нізкіх аб'ёмаў тавараабароту істотных выдаткаў на ўтрыманне — стратныя. Але калі ў вёсцы жыве нават толькі адзін чалавек, яго трэба забяспечваць таварамі і паслугамі.

Вядома, што ў Беларусі спажывецкая кааперацыя традыцыйна лідар у нарыхтоўчай дзейнасці. На Віцебшчыне яе ажыццяўляюць у 101 пункце. Таксама гэтым займаюцца рознічныя гандлёвыя прадпрыемствы. Купляюць больш за 20 відаў сельскагаспадарчай, дзікарослай сыравіны. І не толькі ў грамадзян. У спісе здатчыкаў — фермерскія гаспадаркі, садаводчыя таварыствы і сельскагаспадарчыя кааператывы. Спажывецкая кааперацыя — асноўны нарыхтоўшчык бульбы, агародніны, садавіны, ягад, грыбоў і іншага. За 9 месяцаў года толькі ў грамадзян закуплена сельскагаспадарчай прадукцыі больш чым 13,2 мільёна рублёў.

Каб рэалізоўваць айчынныя бульбу і плодаагароднінную прадукцыю ў міжсезонны перыяд, функцыянуе 21 сховішча. Там адначасова можна захоўваць больш за 7,6 тысячы тон.

Па заказах і ў крэдыт

Пастаўская раённая спажыўкааперацыя на працягу 20 гадоў займае лідзіруючае месца не толькі ў вобласці, але і ва ўсёй рэспубліцы. Тройчы назва калектыву была занесена на Рэспубліканскую дошку Гонару. Двойчы

- **Сёлета па ўсёй вобласці адрамантавалі і рэканструявалі больш за 100 крам.**
- **Удзельная вага спажывецкай кааперацыі ў рознічным тавараабароце Прыдзвіння — 8,7%.**

працоўны калектыў за ўклад ва ўмацаванне эканомікі краіны і стабільнае развіццё атрымліваў падзячны ліст ад Прэзідэнта.

Як адзначыў **Рыгор ЛЕЎКАВЕЦ, старшыня праўлення Пастаўскага раённага спажывецкага таварыства,** у яго больш за 800 падначаленых. Яны працуюць для 36 тысяч землякоў, у тым ліку 12,1 тысячы вяскоўцаў.

— Маем каля 90 крам, больш чым палова якіх — у вёсках. Туды, дзе мала жыхароў, прыязджаюць 10 аўтакрам, — расказвае ён.

У раёне адкрываюцца крамы, не горшыя, чым у абласным цэнтры. Напрыклад, крама №24 «Родны кут». Яе гандлёвая плошча перавышае 500 «квадратаў». Сярод іншага ёсць нават акварыум для рэалізацыі жывой рыбы. Для пастаянных пакупнікоў укаранілі сістэму зніжак (выдаюць дысконтныя карты). Сярэднямесячны тавараабарот — 250,4 тысячы рублёў.

Ва ўсіх крамах арганізаваны продаж па папярэдніх заказах насельніцтва. Актыўна развіваецца гандаль прамысловымі і харчовымі таварамі ў крэдыт.

Залатыя і сярэбраныя

Летась на Сусветнай кулінарнай алімпіядзе ў Германіі майстар-кандытар Святлана Карандашава заваявала сярэбраны медаль, а майстар-повар Галіна Зямчонак — бронзавы. Яна ж сёлета на рэспубліканскім міжгаліновым конкурсе прафесійнага майстэрства «Беларускі майстар — 2017» сярод кухараў-кулінараў узяла Гран-пры.

Эксперты далі высокую ацэнку і прадукцыі райпо. У прыватнасці, у мінулым годзе на рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Смаката-2016» хлябы «Мурамскі аматарскі» і «Манастырскі» заваявалі сярэбраныя медалі. А хлеб «Царскі з сухафруктамі» — Гран-пры. Былі і іншыя ўзнагароды...

— Неаднаразова на рэспубліканскіх конкурсах «Найлепшыя тавары года Рэспублікі Беларусь» («Ласунак») прадукцыя мяснога і кандытарскіх цэхаў узнагароджвалася дыпломамі і ганаравалася званнем лаўрэата, — працягвае Рыгор Леўкавец.

І турызмам займаюцца

Пастаўскае райспажыўтаварыства аказвае насельніцтву больш за 20 відаў паслуг. Сюды ўваходзяць, напрыклад, апрацоўка драўніны, забой жывёлы, камплектаванне падарункаў, рытуальныя паслугі, пракат і іншае...

Займаюцца і, на першы погляд, нестандартнай для такой арганізацыі дзейнасцю. Пазалетась у вёсцы Шыркі ўведзены ў эксплуатацыю комплекс для ажыццяўлення сельскага турызму. База адпачынку знаходзіцца ў маляўнічым кутку. Там ёсць магчымасць адпачыць на прыродзе, правесці карпарацыйныя мерапрыемствы (дзіцячыя і дарослыя дні нараджэння, юбілеі і вяселлі). І ўсё гэта, заўважце, па даступных цэнах...

Шмат гадоў райпо рэнтабельны ва ўсіх кірунках.

У Пастаўскім раёне нават ёсць музей спажывецкай кааперацыі. Ужо каля 13 гадоў ён функцыянуе ў галоўным адміністрацыйным будынку. Там можна ўбачыць каля 800 экспанатаў, звязаных з гісторыяй стварэння і развіцця мясцовай кааперацыі: з 1939 года па цяперашні час.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ШТО МОЖА ДЭПУТАТ

АД КАНКРЭТНАГА ВЫБАРШЧЫКА ДА АГУЛЬНАЙ ПРАБЛЕМЫ

ДЭПУТАТ Брэсцкага абласнога Савета Святлана СЯМАШКА расказвае аб сваёй рабоце, дзеліцца разважаннямі і меркаваннямі пра досвед члена камісіі па пытаннях сацыяльна-культурнай сферы і сацыяльнай абароны насельніцтва. Падчас выбараў чатыры гады таму Святлана Мікалаеўна ўзначальвала гарадскую бібліятэку імя Пушкіна. Цяпер яна кіруе ўсёй культурнай галіной Брэста, з'яўляецца загадчыцай сектара культуры аддзела ідэалогіі, культуры і па справах моладзі гарвыканкама. Варта сказаць, што два папярэднія скліканні яна адпрацавала ў гарадскім Савеце. Так што Святлана Сямашка — дэпутат са стажам.

— Чым адрозніваецца работа ў абласным Савеце ад дзейнасці ў гарадскім выбарным органе?

— Дэпутат гарсавета больш засяроджаны на клопатах менавіта сваёй акругі. Тут жа маштабы шырэйшыя. Мы з калегамі шмат працавалі ў сваёй камісіі. Часцей работа ідзе не ў форме кабінетных пасяджэнняў, а з выездам у рэгіёны. За гэты час я пабывала ва ўсіх раёнах вобласці, у некаторых — не адзін раз. Мы сустракаліся з людзьмі ў працоўных калектывах — часцей сацыяльна-культурнай сферы. Бачылі праблемы, якія існуюць на месцах. Напрыклад, давялося сутыкнуцца з сітуацыяй, калі сельскі школьнік мае здольнасці і жаданне займацца ў музычнай школе, але яго бацькі часова не працуюць. Мала таго, што дзіцяці трэба дабрацца рэйсавым аўтобусам за некалькі кіламетраў у райцэнтр на ўрокі музыкі, дык яшчэ і няма чым заплаціць за вучобу. Вось мы і стараліся паспрыяць, каб канкрэтнаму вучню далі магчымасць атрымліваць дадатковую адукацыю бясплатна.

Заўважу, гаворка ідзе не толькі пра жыхара той ці іншай вёскі, а пра выхад на праблему ў цэлым.

Большасць членаў нашай камісіі — медыкі, можа, таму мы наведалі шмат устаноў аховы здароўя. Прыйшла да высновы, што за нашы бальніцы і паліклінікі можна парадавацца. Нават у аддаленых раёнах медыцынскія ўстановы вельмі і вельмі прыстойна аснашчаныя, што дазваляе аказваць дапамогу на добрым узроўні.

За час склікання я пабывала ў цэлым шэрагу сельгаспрадпрыемстваў, магчыма, упершыню ў жыцці пазнаёмілася з вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі, з асаблівасцямі работы на зямлі, а таксама нюансамі жыцця сельскіх працаўнікоў.

— Такім чынам вы атрымалі шмат новых ведаў, бясцэнны жыццёвы і грамадскі вопыт. Ці паўплывала гэта на вашу асноўную і дэпутацкую работу?

— Вядома, паўплывала. Нават прапанова ўзначаліць культурную галіну горада, думаю, была зроблена мне з улікам маёй дэпутацкай дзейнасці. Ну і ў маёй рабоце члена камісіі, а таксама пры сустрэчах і гутарках з выбаршчыкамі паявілася шырыня бачання праблем. Стала лягчэй знаходзіць адказы на некаторыя пытанні. А пра тое, чаго не ведаеш, можна спытаць у калег. Здавалася б, дробязі, але часам вельмі важныя.

— Што хвалюе жыхароў вашай акругі?

— Маю выбарчую акругу ўтварае ў асноўным прыватны сектар, мікрараён, які ў народзе называюць Кіеўкай. І, вядома, мы з гарадскім дэпутатам, колькі маглі, спрыялі вырашэнню пытанняў добраўпарадкавання. Сёння можна адзначыць, што нарэшце вырашылася праблема «жоўтай» вады. Справа ў тым, што некалькі жылых кварталаў аказаліся ў зоне вельмі старых інжынерных камунікацый водазабеспячэння. У людзей з крана ішла вада жаўтаватага колеру, што выклікала іх нараканні, звароты ў розныя інстанцыі. І вось водаканал замяніў сістэму труб. Цяпер жыльцы дамоў атрымліваюць ваду крыштальнай празрыстасці. Ёсць шмат прыкладаў падобнага кшталту.

Я вельмі радавалася, калі нарэшце ўдалося адрамантаваць сярэднюю школу №6. Гэта адна з самых маленькіх школ абласнога цэнтра, там займаецца ўсяго каля дзвюх соцень вучняў. Школа вядомая сваімі добрымі традыцыямі, слаўная выпускнікамі, і яна заслугоўвала абнаўлення. І вось атрымала яго. Нямала дарог прыведзена ў парадак. Апошняе можна запісаць у актыў як выканаўчай, так і прадстаўнічай улады.

Але ёсць і адваротны бок медаля. Я, вядома, за крытыку ўсебаковую, нават рэзкую. Не крыўджуся на выбаршчыкаў, калі яны пішуць злыя каментарыі. Толькі вось як пачынаеш гаварыць з людзьмі, высвятляюцца дзіўныя рэчы. Скажам, прасілі жыльцы некаторых прыватных дамоў зрабіць тратуар. Калі прыехалі спецыялісты, сталі вывучаць пляцоўку, аказалася, у адным месцы межы ўчасткаў праходзяць так блізка, што тратуар можа атрымацца вузейшы за паўметра. Такім яго немагчыма зрабіць. А вось адступіць ад мяжы свайго агарода хоць бы на 20 сантыметраў ніхто не згадзіўся. Выходзіць, людзі хочуць жыць фактычна ў цэнтры горада, валодаючы прыстойнымі ўчасткамі зямлі з гарадскімі выгодамі, але не дапускаюць нават мінімальнага кампрамісу. Давялося тлумачыць, што навясных тратуараў не бывае, у такім выпадку ім прыйдзецца мірыцца з ранейшымі дарожкамі.

— Якія яшчэ звароты паступалі за час работы ў гэтым скліканні?

— Звароты самыя розныя. У працяг тэмы, якую ўзняла: прыйшла на прыём жанчына пажылога веку, маці траіх дзяцей. У яе шмат прэтэнзій з нагоды розных сацыяльных выгод, грашовых выплат. Сталі разбірацца, высветлілася, што грамадзянка ніводнага дня не працавала. Вядома, хвала ёй і гонар за дзяцей, але ў бюджэт яна не ўнесла ніводнай капейкі падатку. І як яе можна параўнаць з той матуляй, што выгадавала дзяцей і ўсё жыццё працавала? Доўга гаварылі мы з выбаршчыцай, расталіся, можа, і не знайшоўшы поўнага разумення. Так, на жаль, бывае. Як і з асаблівай групай маіх выбаршчыкаў. Кажу «група», бо на тэрыторыі акругі жыве менавіта група людзей, якія называюць сябе веруючымі, і адмаўляюцца атрымліваць пашпарт новага ўзору, адпаведна, не атрымліваюць пенсію. Пра гэта раней шмат пісалі. Людзі прайшлі ўсе інстанцыі, у тым ліку судовыя, а воз, як кажуць, і цяпер там.

Яны прыходзяць да мяне, кажуць: «Мы за вас галасавалі». І праўда, галасаваць ім дазволілі па даведках. А вось пенсіі налічваць і іншыя аперацыі праводзіць можна з наяўнасцю дакумента грамадзяніна краіны. І я нават пры ўсім жаданні дапамагчы не магу. Хоць мне і шкада гэтых людзей.

— Ці шмат зваротаў было па пытаннях працаўладкавання?

— Дастаткова. Асабліва пасля вядомага Дэкрэта №3 людзі валам пайшлі. І ведаеце, ёсць некалькі катэгорый заяўнікаў. Некаторым удалося і дапамагчы, калі яны сапраўды хацелі знайсці работу як крыніцу існавання. Заўважу, многія жыхары райцэнтраў на працу ў Брэст ездзяць. А вось брастаўчане па-ранейшаму перабіраюць. Напрыклад, ёсць у мяне катэгорыя выбаршчыкаў у акрузе, якія раней актыўна ездзілі ў Польшчу, іншыя суседнія краіны. Цяпер сітуацыя памянялася, і ў сярэднім узросце людзям выпала пачынаць з пачатку. У асноўным яны не маюць спецыяльнасцяў, працаваць, як гэта робяць дарожнікі, будаўнікі, камунальнікі, не прывыклі. Хочуць быць вахцёрамі, ахоўнікамі ў гандлёвых цэнтрах. Але названыя месцы, як правіла, занятыя, іх не так многа. Калі ж прапаноўваецца работа, саіскальнік, бывае, адмаўляецца: маўляў, за 300 рублёў працаваць не буду. Ну гэта ўжо яго асабісты выбар. Сёння нават кваліфікаваныя людзі часам працуюць за такія грошы, асабліва ў нашай галіне культуры...

Яшчэ ідуць на прыём маці, бабулі з просьбай уладкаваць дарослых дачку альбо сына. Позняе сталенне маладых людзей — з'ява, з якой у ранейшым жыцці не асабліва даводзілася сустракацца. Заўважаю, як часта нам не хапае актыўнасці, зацікаўленасці. І гэтаму гараджанам часам можна было б павучыцца ў вясковых жыхароў. Падчас выязных сесій і пасяджэнняў камісій мы бачылі прыклады сельскага самакіравання, калі многія пытанні добраўпарадкавання вырашаюцца талакой. Гэта асабліва актуальна ва ўмовах падрыхтоўкі нашага горада да 1000-гадовага юбілею.

— Гэтым вы займаецеся як дэпутат ці загадчык сектара культуры?

— Больш, вядома, па родзе асноўнай работы. Але мае дзверы заўсёды адчынены, выбаршчыкі таксама прыходзяць у любы час з любой ініцыятывай. У нас распрацаваная канцэпцыя святкавання юбілею, працэс падрыхтоўкі распачаты. Маецца на ўвазе не толькі ўзвядзенне і рэканструкцыя аб'ектаў, але ідэалагічны, культурны пласт работы. 1000-гадовы юбілей — гэта свята не толькі горада альбо вобласці, гэта падзея для ўсёй краіны. Не кожны горад мае 1000 гадоў гісторыі. Як вядома, Брэст вызначаны культурнай сталіцай СНД на наступны год. Пройдуць канцэрты, выстаўкі, навуковыя канферэнцыі. Гэта ганаровая місія, з якой горад, несумненна, справіцца. Важнай уяўляецца падтрымка кожнага гараджаніна — і дэпутата, і выбаршчыка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

СУЧАСНАЯ СПАДЧЫНА

АСТРАВЕЦКІЯ «ДАЖЫНКІ» З КАРАЛЕВАЙ

Ажно пяць новых сядзіб з падворкамі за адзін дзень выросла ў аграгарадку Міхалішкі ў Астравецкім раёне. Афармленыя ў традыцыйным беларускім стылі звонку і знутры хаты, вышываныя ручнікі, слоікі з закаткамі, свойскія каўбасы пад столлю, саламяны конь на падворку... Каларытную, аўтэнтычную атмасферу свята «Дажынак», як і планавалі яго арганізатары, тут змаглі перадаць выдатна.

Фота Івана ДЗЯТЛОВІЧА.

Дадайце да гэтага выстаўку снапоў, караваяў, скульптур з агародніны і садавіны, а таксама мноства вырабаў мясцовых умельцаў — і зможаце ўявіць, як умеюць адпачываць працаўнікі палёў і фермаў. Ды і самі Міхалішкі прыбраліся ды падфарбаваліся, каб годна сустрэць гасцей.

Багатае ўбранства і смачныя нацыянальныя стравы сёлета зрабілі найлепшым падворак сельгаспрадпрыемства «Варняны». Работнікі сельгаспрадпрыемства «Гервяты» звязалі найпрыгажэйшы сноп. Самы лепшы ды цяжкі каравай у тры «паверхі» спяклі ў «Гудагаі». А гаспадары свята — «Міхалішкі» — сёлета паказалі сябе ў садавінна-агароднінай скульптуры. Іх кошык са смакатою стаў найлепшым.

Упершыню ў гісторыі «Дажынак» Астравецкага раёна на свяце з'явілася каранаваная асоба. Сярод пяці прыгажунь (па адной ад кожнай гаспадаркі) абралі «каралеву жніва — 2017». Ёй стала Іна Ляховіч з Міхалішкаўскай гаспадаркі.

— Свята атрымалася маштабнае і відовішчнае. Шэсць гадзін проста праляцелі, — падзялілася **Тэрэса ПАМЕЦЬКА, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Астравецкага райвыканкама.** — Усе ахвотныя маглі прыехаць у Міхалішкі на бясплатным аўтобусе і пачаставацца нацыянальнымі стравамі.

«З дзяцінства памятаем, з якім размахам адзначаліся «Дажынкі»! З'язджаўся ўвесь калгас, аж паветра гуло. Сталы накрывалі даўжэзныя. Гэта беларускае свята, якое адзначалі яшчэ нашы продкі. І нашчадкам трэба захоўваць гэтую добрую традыцыю», — мяркуюць мясцовыя жыхары.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

(Больш здымкаў глядзіце на сайце zviazda.by.)

ПРАБЛЕМА З ІКЛАМІ

Каб воўк «не паказваў зубы»

Што робіцца для рэгулявання колькасці драпежніка?

У сувязі з частымі выпадкамі з'яўлення дзікіх жывёл (у прыватнасці, ваўка) у малых населеных пунктах Міністэрства лясной гаспадаркі палічыла неабходным выступіць з тлумачэннямі па гэтай праблеме.

Сёлета па ініцыятыве Мінлясгаса і ў мэтах выканання даручэння Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь былі арганізаваны і праведзены ўлікі колькасці ваўка на тэрыторыі ўсёй краіны. Пад абследаванне трапілі фонды паляўнічых угоддзяў, фонды запасу паляўнічых угоддзяў, тэрыторыі, у адпаведнасці з рэжымам аховы і выкарыстання якіх канфіскацыя дзікіх жывёл забаронена або абмежавана.

Па выніках усіх праведзеных улікаў колькасць ваўка па стане на 1 лютага гэтага года склала 2 113 асобін. У тым ліку на тэрыторыях: паляўнічых угоддзяў, якія арандуюцца, — 1 495 асобін; фонду запасу паляўнічых угоддзяў — 120 асобін; асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Рэспублікі Беларусь (заказнікі рэспубліканскага і мясцовага значэння), якія не ўваходзяць у фонд паляўнічых угоддзяў, — 117 асобін; зон адчужэння і адсялення Гомельскай і Магілёўскай абласцей — 191 асобіна; Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка — 190 асобін.

На падставе атрыманых даных аб колькасці ваўка вызначаны вобласці (Віцебская, Гомельская, Магілёўская) і адміністрацыйныя раёны (Браслаўскі, Гарадоцкі, Брагінскі, Хойніцкі, Веткаўскі, Кармянскі, Чачэрскі, Ельскі, Рэчыцкі, Лельчыцкі, Краснапольскі, Клімавіцкі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі), у якіх неабходна праводзіць першачарговыя мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці гэтага віду паляўнічай жывёлы.

Па даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў у 2016 годзе было здабыта 1 775 асобін ваўка. Сёння на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях паляванне на ваўка забаронена. Разам з тым у Беларусі воўк не знаходзіцца пад пагрозай знікнення, таму адсутнічае і неабходнасць у Плане кіравання яго папуляцыяй на тэрыторыі краіны.



З улікам існуючага ў цяперашні час негатыўнага ўздзеяння ваўкоў на жыццё, здароўе і маёмасць грамадзян, па хадайніцтве Мінлясгаса, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь даручыў Мінпрыроды ў бягучым годзе дапрацаваць План кіравання папуляцыяй ваўка, у тым ліку ў частцы яго дзеяння не на ўсёй тэрыторыі краіны, а толькі на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і іншых тэрыторыях, дзе канфіскацыя дзікіх жывёл забаронена або абмежавана, і ўзгадніць яго з усімі зацікаўленымі ведамствамі.

Немалаважным фактарам з'яўляецца зацікаўленасць карыстальнікаў паляўнічых угоддзяў і паляўнічых у здабычы ваўка. Але значныя матэрыяльныя затраты на арганізацыю і правядзенне паляванняў на ваўка не дазваляюць асобным карыстальнікам паляўнічых угоддзяў рэгулярна ажыццяўляць адпаведныя мерапрыемствы. У выніку гэта прыводзіць да распаўсюджвання драпежніка па тэрыторыі паляўнічых угоддзяў. Створаныя брыгады паляўнічых не могуць кругласутачна знаходзіцца ва ўгоддзях у чаканні з'яўлення ваўка.

Практыка дагаворных абавязацельстваў паміж карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў і сельскагаспадарчымі арганізацыямі (сялянска-фермерскімі гаспадаркамі) па матэрыяльным стымуляванні за канфіскацыю ваўка сёння не знаходзіць развіцця — з прычыны фінансавага становішча дадзеных сельскагаспадарчых арганізацый.

У гэтай сувязі па даручэнні Мінлясгаса карыстальнікамі паляўнічых угоддзяў краіны ўстаноўлены розныя меры матэрыяльнага стымулявання за праведзеныя на тэрыторыі арандаваных паляўнічых угоддзяў мерапрыемствы па рэгуляванні колькасці драпежных жывёл (ваўка, лісіцы, янотападобнага сабакі). Да такіх мер адносяцца грашовыя ўзнагароды; забеспячэнне льгот пры рэалізацыі паляўнічых пуцёвак, дазволаў на здабычу паляўнічай жывёлы і паляўнічых пуцёвак да іх.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

СЯБАР ЧАЛАВЕКА

ВЫХАВАННЕ САБАК ПАЧЫНАЕМ... З СЯБЕ

Што трэба зрабіць, каб і нам, і ім жылося камфортна

А пошнім часам ва ўжытак мінчан актыўна ўвайшло новае слова «дог-фрэндлі», што ў даслоўным перакладзе значыць «дружалюбны ў дачыненні да сабак». Мы пастараліся разабрацца, што гэта такое.

Адна з арганізацый, якая зараз актыўна займаецца тэмай сабак у гарадской прасторы, — OkiDog. **З куратарам праекта Ганнай ЦІШКЕВІЧ** сустракаемся ў кавярні, якая не так даўно атрымала той самы статус «дог-фрэндлі», а гэта значыць, што сюды «па законе» можна прыходзіць з гадаванцамі. Праўда, у будны дзень увечары, нягледзячы на тое, што вольных столікаў не было, ніхто гэтай магчымасцю не скарыстаўся. (Не ўсё адразу: да добрага, хоць і не так доўга, але ўсё роўна трэба прывыкаць.)

Сёння ў праекта ёсць два асноўныя кірункі: першы арыентаваны на стварэнне неабходнай інфраструктуры, другі — на ўзняцце агульнага ўзроўню культуры ўзаемадзеяння з сабакамі. Сюды адносяцца тэматычныя сустрэчы і заняткі ў школах. Дарэчы, па словах Ганны, менавіта яны аказваюцца найбольш эфектыўным сродкам прывіцця культуры. Падчас урока прафесійны кінолаг расказвае пра мову зносін сабак, што значаць тыя ці іншыя жэсты, як паводзіць сябе ў розных сітуацыях, як узаемадзейнічаць са свойскімі і вулічнымі сабакамі. Апошняе асабліва важна ў тым сэнсе, што блакітная мара ледзь не кожнага дзіцяці — шчанюк з прыгожым банцікам, падораны на дзень нараджэння. Але далей думка павінна ісці не аб прыгожых фотаздымках у сацыяльных сетках, а аб велізарнай адказнасці за жывую істоту. На ўроку кажуць і пра гэта. Натуральна, ад фармату мерапрыемства дзеці прыходзяць у захапленне: бо іх чакае не складаная матэматыка, а сустрэча з сімпатычным сабачкам проста ў школе.

Працаваць на перспектыву і верыць, што дзякуючы падрастаючаму пакаленню праз дваццаць гадоў у дварах будуць панаваць абсалютныя чысціня і парадак, вядома, добра, але гэта не вырашае праблем, якія існуюць на дадзены момант. Як аказалася, справа не толькі ў ініцыятыўнасці гараджан і іх жаданні мяняцца. Скажам, установа спецыяльнай скрыні для збору адходаў жыццядзейнасці свойскіх жывёл ператвараецца ў сапраўдную галаваломку. Бо, згодна з дзеючым заканадаўствам, прыдваровыя тэрыторыі не прызначаны для выгулу сабак, а значыць, і ўсталёўваць на іх урны не мае сэнсу.

— Да нас часта звяртаюцца жыхары тых ці іншых дамоў з просьбай дапамагчы ім з установкай, яны гатовыя самі ўсё аплаціць. Але гэта даволі складаны працэс — трэба атрымаць дазвол ад гарадскіх уладаў. Людзі разумеюць, што трэба будзе правесці вялікі аб'ём работы па ўзгадненнях, і адмаўляюцца ад ідэі. Прасцей урэгуляваць пытанне на тэрыторыі прыватнай забудовы, як, напрыклад, зрабілі ў мікрараёне «Новая Баравая». Так што выпадкаў, калі жыхарам удалося самастойна ажыццявіць задуманае, я пакуль назваць не магу. Але мы працуем над гэтай важнай тэмай, — расказвае куратар праекта.

Справа яшчэ і ў тым, што ўстаноўка, здавалася б, такога прымітыўнага аб'екта, як урна, — дарагі працэс. У Беларусі пакуль няма наладжанай вытворчасці неабходнага абсталявання, і паводле папярэдніх падлікаў адна такая ёмістасць можа абысціся прыблізна ў 1000 рублёў. А яе трэба яшчэ і даглядаць...

Пакуль жа актыўныя мінчане пачалі з ўстаноўкі таблічак аб неабходнасці прыбіраць за сваімі гадаванцамі.

Такія напаміны ўжо з'явіліся ў парках 50-годдзя Кастрычніка, Сляпянскай воднай сістэмы, імя Грэкавай, Антонаўскім, Кіеўскім, скверы Старосцінская слабада. Дарэчы, у парках выгульваць сабак афіцыйна таксама нельга, але ісці праз іх да месца выгулу не забараняецца — на такіх шляхах і ўсталёўваюць таблічкі. І ўсё ж жаданне пашпацыраваць менавіта па парку можна зразумець: альтэрнатыўных варыянтаў не так шмат. Па-першае, пляцоўкі для выгулу зусім невялікія па памеры, а жывёлам, якія цэлыя дні праводзяць у кватэры, патрэбна прастора. Па-другое, не для ўсіх гэтыя пляцоўкі знаходзяцца ў кроквай даступнасці, а весці сабаку кудысьці спецыяльна «для выгулу» больш нагадвае здзек з яго.

— Але мы супраць крытыканства ў дачыненні да гарадскіх уладаў. Наша пазіцыя: можаш — рабі сам. І жыхары Мінска даволі актыўна падтрымліваюць гэты светапогляд: усё больш тых, хто без угавораў і напамінкаў самастойна прыбірае за сваімі гадаванцамі. Такім чынам, мы чарговы раз вяртаемся да пытання культуры, — адзначае Ганна.

Па словах Ганны Цішкевіч, людзі, закранаючы гэту тэму, часта кажуць: «Мы хочам жыць як у Еўропе». Але ж Еўропа славіцца не толькі добра развітой гарадской інфраструктурай, але і талерантным стаўленнем да розных сацыяльных груп і іх патрэб. Пытанне аб свойскіх жывёлах на дадзены момант там нават не ўзнікае: людзі, не задумваючыся, прыходзяць з гадаванцамі ўсюды, куды ім трэба. Да нас такое стаўленне прыходзіць паступова: уладальнікі некаторых сталічных установаў ужо самі імкнуцца атрымаць той самы статус «дог-фрэндлі» — шукайце адпаведны стыкер на дзвярах. Акрамя гэтага, такія кафэ арганізацыя OkiDog забяспечвае паілкай і пэўным запасам корму.

— Нараканняў мы пакуль не чулі. Былі негатыўныя каментарыі на некаторых інтэрнэт-рэсурсах, але мы разумеем, чаму людзі так пішуць. У сабак таксама розныя тэмпераменты: камусьці падабаецца знаходзіцца ў грамадстве, а камусьці — не. Усё рэгулюецца адэкватнасцю гаспадара і тым, ці пойдзе ён з асацыяльным сабакам у кафэ. Але большасці гаспадароў і самім не патрэбны падобныя праблемы, — адзначае Ганна.

У планах праекта — ахапіць большую колькасць установ і грамадскіх прасцёраў. І, зноў жа, навучыць людзей культуры... Культуры!

Дар'я КАСКО.
kasko@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А.А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л.А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А.Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В.В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т.Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 28 лістапада 2017 года.**